60 ГАДОЎ НА КАРЫСЦЬ КРАІНЫ
ЧЫРВОНКА



НАЙПЕРШ НЕ КІРАЎНІК, А ЎРАЧ
ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
22 ЧЭРВЕНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 118 (29998)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар СЕРГЕЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«У пытаннях ідэалагічнай работы павінен быць зацікаўлены і кіраўнік прадпрыемства. Фармалізму тут не павінна быць, важна разумець, навошта тое робіцца. Гэта індывідуальная работа. Кадраў яна таксама датычыцца. Калі кіраўнік сам не займаецца падрыхтоўкай і выхаваннем кадраў для будучыні свайго ж прадпрыемства, дзяржаўнай ці прыватнай формы ўласнасці, ніхто не прыйдзе і не зробіць гэта за яго, ніхто не замацуе людзей на месцах».*

# МЫ ВЕДАЕМ ЖАХІ ВАЙНЫ НЕ ПА ЧУТКАХ...

## Зварот з нагоды Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа

*Паважаныя суайчыннікі!*

*Сёння ўся Беларусь згадвае трагічныя падзеі 22 чэрвеня 1941 года. На досвітку вайна вераломна ўварвалася ў наш дом, бязлітасна разбурыўшы лёсы, сем'і, гарады і вёскі.*

*Больш як тры гады беларуская зямля літаральна стагнала ад зверстваў нацыстаў. У разбуральным пажары вайны загінуў кожны трэці жыхар краіны.*

*Нечалавечая жорсткасць не зламала волю нашага народа. Абарона роднай зямлі з'яднала ўсё цывільнае насельніцтва рэспублікі ва ўсеагульным супраціўленні фашызму. Нашы дзяды і прадзеды падвергліся катаванням і тэрору, але захавалі свае гонар і годнасць.*

*Праз дзесяцігоддзі шчаслівага жыцця на планеце зноў склалася сітуацыя, калі палатно мірнага часу вось-вось разарвецца. Чарговы памылковы крок цынічных заходніх палітыкаў можа стаць апошнім для большай часткі чалавецтва.*

*Ведаючы не па чутках аб жахах вайны і цане перамогі, беларускі народ захоўвае гістарычную праўду, умацоўвае дзяржаўны суверэнітэт і адзінства нацыі ў імя міру на роднай зямлі.*

*У гэты журботны дзень у гонар воінаў-вызваліцеляў і ўсіх паўшых, але не пакораных схілім галовы ў мінуту маўчання.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**




Фота БелТА

*Ала, Светлагорскі раён.*

## КОРАТКА

- **Кінастужку «Брэсцкая крэпасць» паказалі ў кітайскім Чунцыне.**
- Беларусь плануе павялічыць пастаўкі прадукцыі машынабудавання ў Самарскую вобласць.
- **У Беларусі прапануюць зрабіць абавязковай дзяржрэгістрацыю маёмасці.**
- Стаўка рэфінансавання з 28 чэрвеня зніжаецца да 9,5% гадавых.



- **Больш за 100 кг манет сабралі ў Гродзенскай вобласці для знака «Жывая памяць удзячных пакаленняў».**
- Забароны і абмежаванні на наведванне лясоў захоўваюцца ў 72 раёнах Беларусі.

# ЖЫЦЬ І ПОМНІЦЬ



### У Брэсце пачаліся мерапрыемствы Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа

**Значная падзея адбылася зранку 21 чэрвеня на Гарнізонных могілках Брэста. Ва ўрачыстай абстаноўцы тут адкрылі Алею Памяці. Алея ў гонар абаронцаў Радзімы розных нацыянальнасцяў стала яшчэ адным знакам памяці і пашаны ў горадзе, які першы адчуў на сабе страшнае дыханне вайны.**

### АБАРОНЦАМ РОЗНЫХ НАЦЫЙ І НАРОДНАСЦЯЎ

З прапановай увекавечыць памяць землякоў, якія загінулі падчас вайны, да гарадскіх улад звярталіся прадстаўнікі Рэспублікі Інгушэція, Чачэнскай Рэспублікі прыкладна паўтара дзясятка гадоў таму. Тады паявілася ідэя стварыць Алею Памяці. І вось добрая справа знайшла канкрэтнае ўвасабленне ў памятных плітах — інфармацыйных дошках, якія змяшчаюць звесткі аб слаўных сынах агульнай тады Айчыны, што аддалі жыцці на беларускай зямлі.

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе
Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Адпачынак-2023

# ПЕРШАЯ ЗМЕНА ЗАВЯРШАЕЦЦА. ДРУГОЙ — ПАДРЫХТАВАЦЦА!

## Як праходзіць сёлета дзіцячае аздараўленне?

**У дзіцячых аздараўленчых лагерах завяршаецца першая змена. Палова юных беларусаў, якія выказалі жаданне правесці час у дзённых ці загарадных лагерах, ужо заканчвае свой адпачынак. Такім чынам, каля 200 тысяч дзяцей атрымалі яркія ўражанні ад першага месяца лета падчас першай змены аздараўленчай кампаніі. Усяго ж у лагерах мяркуецца аздаравіць 377 тысяч школьнікаў.**



### На дапамогу — 64 млн рублёў

Як расказаў **намеснік дырэктара Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні Аляксандр ЦАЙ,** штогод бясплатныя пуцёўкі і пуцёўкі з дзяржаўнай датацыяй на аздараўленне ў нашай краіне атрымлівае каля 700 тысяч дзяцей. На гэтыя сродкі з бюджэту выдаткоўваецца дзяржаўная падтрымка, сёлета яна склала каля 200 мільёнаў рублёў.

На летнюю аздараўленчую кампанію бягучага года выдаткавана больш за 64 мільёны рублёў, у тым ліку 62 — на патанненне пуцёвак, 1,5 мільёна — на бясплатныя пуцёўкі для дзяцей-інвалідаў, сірот і тых, хто пражывае на забруджаных радыенуклідамі тэрыторыях, 600 тысяч — на падрыхтоўку загарадных стацыянарных лагераў для прыёму дзяцей.

Сёлета ў Беларусі свае дзверы расчыніла каля 6 тысяч лагераў, у тым ліку 4,5 тысячы з іх з дзённым знаходжаннем, 1,5 тысячы — з кругласутачным. У бягучым годзе ў другім тыпе лагераў пройдзе аздараўленне больш як 155 тысяч юных беларусаў. У захаванне і ўмацаванне іх матэрыяльна-тэхнічнай базы ўкладзены значныя сродкі: летась — 18 мільёнаў рублёў, сёлета — 20 мільёнаў.

Усяго ж штогод, паводле інфармацыі Аляксандра Цая, 50 % дзяцей у Беларусі праходзяць санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне.

### 15 тысяч юных гасцей з-за мяжы

Як паведаміў **начальнік галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Віктар ДОЎНАР,** у краіне створана дастаткова развітая сістэма аздараўлення, і гэта дае магчымасць забяспечыць не толькі нашы ўнутраныя патрэбнасці.

— Мы праводзім работу па аздараўленні дзяцей з-за мяжы. Гэта не новая традыцыя, ёй больш за 20 гадоў. Толькі за апошнія дзесяць гадоў з-за мяжы ў нас аздаравілася каля 15 тысяч дзяцей. Геаграфія краін шырокая — Расія, Узбекістан, Ізраіль, Польшча, Малдова, Літва, Латвія, Сірыя, — расказаў Віктар Доўнар.

Сёлета з сярэдзіны мая дзве дэлегацыі з Сірыі аздараўляліся ў Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня». Разам з тым дзеці з-за мяжы праходзяць аздараўленне ў кожным рэгіёне Беларусі.

Дапамогу ў аздараўленні дзецям, у тым ліку і замежным, аказвае і Беларускі Чырвоны Крыж. Сем'і з Украіны, якія выхоўваюць дзяцей, сёлета атрымаюць па 600 рублёў, паведаміў **генеральны сакратар Беларускага Чырвонага Крыжа Дзмітрый ШАЎЦОЎ.**

— Сёлета для таго, каб зрабіць вялікі ахоп, мы вырашылі не непасрэдна аздараўляць дзяцей у санаторыях, а выдзеліць грашовыя сродкі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей з Украіны, — расказаў ён. — Аказваем дапамогу і дзецям, што маюць у гэтым патрэбу, з іншых краін. Акрамя Украіны, гэта і Сірыя, і Лівія, і Іран — у залежнасці ад года.

### Сем тысяч дзяцей адпачне ў «Зубраняці»

Найбольшую колькасць дзяцей з-за мяжы традыцыйна прымае айчынны флагман аздараўлення — Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня». Яго **дырэктар Надзея АНУФРЫЕВА** адзначыла, што сёлета за кошт новага будаўніцтва колькасць месцаў у цэнтры ўдалося павялічыць на 50, што дасць магчымасць за пяць летніх змен адпачыць дадаткова 250 дзеткам. Усяго ж за за адну змену ў «Зубраняці» аздараўляецца 1,5 тысячы дзяцей, а за ўсё лета — сем тысяч. У цэнтры забяспечана аздараўленне беларускіх дзяцей і ёсць усе магчымасці для запрашэння замежных гасцей.

— Трэба дапамагаць адзін аднаму, развіваць міжнароднае супрацоўніцтва. У выніку ўсе месцы занятыя, усе шчасліва адпачываюць. Прапанова на 2024 год — пакет з дзевяці краін, якія мы можам запрасіць, — расказала Надзея Ануфрыева. — Мы ні ў якім разе не робім нічога на шкоду беларускім дзецям. Мы нарошчваем не толькі агульную колькасць месцаў, але і агульную колькасць беларусаў, якія адпачылі. Сёлета ўсе пяць змен былі ў першую чаргу ўкамплектаваны беларусамі. Прыём дзяцей з Сірыі быў перасунуты на больш ранні тэрмін. Мы працуем летам так, каб не было ніводнага дня без дзяцей у цэнтры.

У «Зубраня» прыязджаюць дзеці з розных рэгіёнаў Расіі. Ёсць спецыяльныя праекты Саюзнай дзяржавы па ўзаемадзеянні ў галіне аздараўлення. Таксама прыязджаюць дзеці з В'етнама, Індыі, Арменіі, Азербайджана, Узбекістана, Кыргызстана і іншых краін.

### Усе дзеці з Данбаса пасля аздараўлення вярнуліся дадому

Дзеці з пацярпелых рэгіёнаў Данбаса праходзяць у Беларусі рэабілітацыю, у тым ліку пры ўдзеле дабрачыннага фонду **Аляксея ТАЛАЯ.** Яго дырэктар і стваральнік падкрэсліў, што першапачаткова задума была аздараўляць дзяцей-інвалідаў. І ў верасні 2021 года ў нашу краіну прыехала першая такая група з ДНР з дзевяці дзяцей і сямі дарослых, якія іх суправаджалі. Затым, у верасні-кастрычніку таго ж года, у «Зубраня» прывезлі групу з сотні здаровых дзяцей. Пасля былі яшчэ групы: у чэрвені і кастрычніку 2022-га. Прычым апошняя была самай вялікай — 888 дзяцей і каля 200 дарослых, якія іх суправаджалі.

— Яны прыбылі ў Беларусь і вярнуліся ў поўным складзе на радзіму на цягніку. З той пары, кіруючыся бяспекай дзяцей, мы вырашылі, што ўсе групы будуць прыязджаць і з'язджаць на цягніку, — адзначыў Аляксей Талай.

Ён падкрэсліў, што ў яго маецца спіс з усімі прозвішчамі з тысячы дзяцей, якія прыязджалі ў Беларусь праз яго фонд на аздараўленне. Усе да аднаго пасля адпачынку яны вярнуліся да сваіх сем'яў і блізкіх. Удзячныя бацькі на сайце фонду пакідаюць толькі станоўчыя водгукі і падзякі.

— Сёлета мы працягнулі, вядома ж, дапамогу дзецям-інвалідам, якія прыбылі да нас на аздараўленне ў маі 2023 года, у тым ліку ў Рэспубліканскую дзіцячую бальніцу медыцынскай рэабілітацыі. І ёсць вялікія поспехі. Адно дзіця з Данецка з цяжкай формай ДЦП, якое прайшло рэабілітацыю ў нас у краіне, нарэшце пайшло, — распавёў Аляксей Талай.

Паралімпіец адзначыў, што раней гэтаму дзіцяці ён падарыў сваю інвалідную каляску з электрапрыводам, аб якой той марыў. Гэта легендарная каляска, прывезеная з Паралімпійскіх гульняў у Токіа.

— Калі даведаўся, што тое дзіця пра яе марыць, а яно бачыла кадры ў інтэрнэце, як я ганяю са сваімі дзеткамі на гэтай калясцы з электрапрыводам, мы досталі яе з запаснікаў і з вялікай радасцю ўручылі яго сям'і, — падзяліўся ён. — Сёння дзіця ўжо ўстала з крэсла і шукае варыянты, каму б гэтую каляску падарыць.

Заснавальнік фонду падзякаваў рэабілітолагам, урачам, усяму персаналу лагераў і рэабілітацыйным цэнтрам за вялікую праведзеную работу.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Юань упершыню абышоў долар і еўра ў трансгранічных разліках КНР



Кітай у трансгранічных разліках з гандлёвымі партнёрамі пачаў выкарыстоўваць юань часцей, чым долары і еўра. Аб гэтым паведаміла RT са спасылкай на статыстыку Дзяржаўнага валютнага ўпраўлення Кітая. КНР максімальна зменшыла выкарыстанне гэтых дзвюх валют у сваіх трансгранічных разліках. Паводле звестак Дзяржаўнага валютнага ўпраўлення КНР, у мінулым месяцы доля юаня дасягнула гістарычнага максімуму — 49,6 працэнта, а долары і еўра ў трансгранічных разліках Кітая склалі 47,9 працэнта. Гэта стала самым нізкім узроўнем за ўвесь час назіранняў. Адзначаецца, што ў 2010 годзе пры знешнім гандлі Кітай аддаваў першае месца плацяжам у амерыканскай і еўрапейскай валюце, на якія прыпадала 86-90 працэнтаў. Пасля паступова тыя лічбы сталі зніжацца. Як адзначаюць эксперты, такім чынам кітайскія ўлады разлічваюць зменшыць уразлівасць перад верагоднымі абмежаваннямі з боку краін Захаду. Палітыка, што праводзіцца ў апошні час Злучанымі Штатамі Амерыкі і ЕС, знізіла міжнародны давер да іх фінансавых сістэм, у сувязі з чым многія краіны пачалі выкарыстоўваць у міжнародным гандлі свае валюты. Аналітыкі лічаць працэс дэдаларызацыі непазбежным, хоць і расцягнутым у часе.

### Прэзідэнт Бразіліі заявіў аб неабходнасці рэфармаваць Савет Бяспекі ААН

Савет Бяспекі ААН мае патрэбу ў рэформе, праз 80 гадоў пасля яго фарміравання неабходны орган з прадстаўніцтвам краін Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, заявіў прэзідэнт Бразіліі Луіс Інасіу Лула да Сілва ў інтэрв'ю італьянскай газеце Corriere della Sera. Паводле яго слоў, Бразілія лічыць, што «шматпалярны свет лепшы, чым аднапалярнае панаванне або біпалярная спрэчка». Прэзідэнт Лула адзначыў: «стварэнне розных сетак», заключэнне пагадненняў паміж краінамі можа дапамагчы збалансаваць і ўраўнаважыць кантраструючыя тэндэнцыі і напружанасць.

# Гуртаваць вакол сябе аднадумцаў

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА ў ходзе рабочай паездкі ў Брэст правяла сустрэчу з актывам і членамі ГА «Беларускі саюз жанчын». У сустрэчы ўдзельнічалі таксама старшыня грамадскай арганізацыі «БСЖ» Вольга ШПІЛЕЎСКАЯ, старшыня абласнога аб'яднання «БСЖ» Валянціна ПУХ, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі аблвыканкама Таццяна ГАГАКАВА.**

— Беларускі саюз жанчын — адна з вядучых арганізацый нашай краіны, што складаюць аснову грамадзянскай супольнасці, — сказала Наталля Качанава. — Мы рады, што ў арганізацыю ўступае ўсё больш жанчын. Важна, каб сюды прыходзілі людзі, якія спакойна працуюць у сваіх рэгіёнах, каб яны гуртавалі вакол сябе аднадумцаў. Усё гэта дазволіць вырашаць маштабныя і лакальныя задачы, важныя для развіцця нашай краіны.

Наталля Качанава акцэнтавала ўвагу прысутных на сацыяльна-эканамічным развіцці краіны, падтрымцы традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, вырашэнні дэмаграфічнага пытання, засяродзіла ўвагу на задачах, якія стаяць перад жаночай грамадскай арганізацыяй. Гаварылі пра важнасць моцных рэгіёнаў, вырашэнне праблем занятасці насельніцтва, аб зарплатах і цэнах, аб складніках шчаслівай сям'і. Не абышлі ўвагай будучую электаральную кампанію, якой у хуткім часе будзе дадзены старт.

**Яна СВЕТАВА.**

Па сутнасці

# Нельга забыць



Гарэзлівае дзяцінства ў дзядулі на вакацыях. Калі яшчэ напярэдзе амаль усё лета, але промні сонца ўжо паспелі пакінуць свой след на целе. Хораша. Весела. Шчэбет дзятвы. Падыходзіць дзядуля і кажа: «Сёння пачалася вайна». Больш нічога не прамовіў. Нічога. Мы сціхлі. Ён з вайной сустрэўся падлеткам, а скончыў на Эльбе разведчыкам. Мы таксама думалі: з вайной мы будзем сустракацца падчас успамінаў нашых герояў, у кніжках і фільмах. Памыліліся. Горача і жахліва. Вайна — побач. Страшна — паміж суседзямі.

Гэта вайна супраць нас. Усіх разам і кожнага пасобку. Што сотні гадоў назад, што цяпер місіянеры заходняга ладу жыцця тыя ж. Тады на лёзах мячоў пасланцаў Ватыкана, пасля на танкавых гусеніцах Гудэрыяна была кроў. Кроў нашых дзяцей. Адно адрозненне — раней Рым быў цэнтрам Еўропы, а цяпер заваёўніцкую «рымскую імперыю» прысабечылі англасаксы. А дакладней, іх фінансавыя эліты. Тады як некалі Еўропа была ў палоне Гітлера, так і цяпер яна зноў у палоне інтарэсаў і амбіцый фінансавага істэблішменту. Дагулялася ў талерантнасць і постгуманізм. Як некалі рускі салдат вызваляў напужанага еўрапейца з Майданека і Асвенцыма, так і сёння — з палону мілітарызму і здзекаў з чалавечай прыроды.

Але цяпер разам з ударнымі танкавымі групамі Столтэнберга — тэхналогіі. Наступаюць на свядомасць. Ізноў у прыцемках, калі нас апанаваў сон. Мроілі аб сяброўстве, усходнім і звычайным. Мроілі аб еўрапейскасці. Украінцы ўжо прачнуліся. Многія — пад грукат кананады ў сырых акопах. Вось яна, сапраўдная рэчаіснасць партнёрства. Усходняга. Бясконцы паход «дранг нах остэн» калектыўнага Захаду.

Дзень Перамогі — вялікае свята Перамогі Жыцця. Зямны Вялікдзень. 22 чэрвеня — дзень памяці, смутку і жалобы. Для ўсіх, нягледзячы на палітычную афарбоўку. Нават для тых, хто сёння з нашыўкамі калабарацкіх сцягоў. Бо пад бомбамі не прачнуліся продкі розных беларусаў. А цяпер расплюшчыце вочы: калоны ворагаў пайшлі ў наступленне. На вашу свядомасць таксама. Няўжо бязлітасная «глабальная павуціна» сцерла з вашай памяці 22 чэрвеня? Няўжо вы на баку тых, хто паліў Хатынь і адбіраў у бацькоў дзяцей для сваіх салдат, высцікаючы да апошняй кроплі крыві?

Ізноў гучаць заклікі знішчаць прадзяржаўных беларусаў. Сёння ёсць, як і тады былі, адкрытыя ворагі, ідэйныя здраднікі, прыстасаванцы. Былі і ёсць «нейтральныя». Як кажуць цяпер, палітычныя абывацелі. Няважна, які сцяг на ратушы ці выканкаме, — абы быў заробак. Прачніцеся! Расплюшчыце вочы. Нават калі вы не маеце нацыянальнай годнасці, паверце: вас усё адно падлічаць кулямі акупанты, калі здарыцца так, што яны сюды зойдуць. Як тое на зямлі беларускай было ўжо неаднойчы. Лепш сказаць — заўжды. Геапалітычнае скрыжаванне. Ізноў па слядах, пакінутых ботамі эсэсаўцаў, намагаюцца прайсці натаўскія чаравікі. Не атрымаецца!

22 чэрвеня — гэта не толькі пра Вялікую Айчынную. Гэта ўвогуле пра тое, як мы адстойвалі правы «людзьмі звацца». Каб у нашых дзяцей і надалей было гарэзлівае дзяцінства ў вёсцы альбо ў юнакоў і дзяўчат — насычанае падзеямі гарадское жыццё, каб нашы выпускнікі маглі сустрэць світанак без парахавога дыму, каб беларусы маглі спакойна жыць і працаваць. Каб мы ўсё гэта памяталі — будзе і надалей гучаць метраном каля ўвахода ў Брэсцкую крэпасць. Каб больш ніколі з абдымкаў Беларусі не вырывалі яе дзяцей і не кідалі іх у полымя.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:

## «Наш галоўны абавязак — не дапусціць паўтарэння трагедыі»

**Напярэдадні Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны Старшыня Палаты прадстаўнікоў усклаў кветкі да скульптуры «Журботная маці» на брацкай магіле ў сталічным парку Чалюскінцаў.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Спікер ніжняй палаты парламента нагадаў, што 22 чэрвеня 1941 года на нашу зямлю прыйшла вялікая бяда. «Вайна перакрэсліла ўсе надзеі людзей, прынесла гора, пакуты нашаму народу, — адзначыў ён. — Загінуў кожны трэці беларус. Вельмі важна, што мы ўспамінаем і дзякуем усім тым, хто аддаў сваё жыццё за незалежнасць нашай Радзімы, хто фактычна забяспечыў нам цяперашняе жыццё і нашу будучыню».

Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў, што беларусы ўсіх памятаюць і працягваюць аднаўляць імёны загінулых у гады Вялікай Айчыннай. «Па сканчэнні 82 гадоў нам зноў даводзіцца абараняць незалежнасць нашай краіны, — звярнуў увагу Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Мы бачым, які ціск аказваецца на Рэспубліку Беларусь, спробы дэстабілізаваць сітуацыю ў нашай краіне, раскалоць грамадства, удушлівыя санкцыі. Але, нягледзячы на гэта, дзякуючы той палітыцы, якую праводзіць Прэзідэнт, у цэлым улады, падтрымцы нашага народа мы выстаялі. Краіна развіваецца, і, вядома, наш самы галоўны абавязак — кожнаму на сваім працоўным месцы рабіць сваю справу, захаваць мір, чыстае неба і не дапусціць паўтарэння трагедыі 22 чэрвеня 1941 года».

**Паводле БелТА.**

Уладзімір ПЯРЦОЎ:

## «Мы нясём праўду пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны»

**Кіраўнікі СМІ на чале з міністрам інфармацыі ўшанавалі памяць ахвяр Вялікай Айчыннай вайны, усклаўшы кветкі ў мемарыяльным комплексе «Масюкоўшчына» ў Мінску.**



Фота БелТА.

Кіраўнік інфармацыйнага ведамства зауважыў, што як толькі мы пачынаем забываць гісторыю, адразу тыя, хто вельмі б хацеў у памяць аб сваіх дзядах і прадзедах, якія прыходзілі на нашу зямлю далёка не з дабром, а з жаданнем заняволіць наш народ і захапіць нашу краіну (тады вялікую краіну), намерваюцца здзейсніць маленькі рэванш. Па словах Уладзіміра Пярцова, інфармацыйны вакуум заўсёды запаўняецца досыць хутка. «Калі колькасць матэрыялаў у газетах, часопісах, на тэлебачанні і ў інтэрнэце скарачаецца, ён адразу ж запаўняецца нейкай альтэрнатыўнай няпраўдай аб нейкіх вызваліцелях, якія неслі на нашу зямлю еўрапейскія каштоўнасці, і іншым глупствам, якое часам прыжываецца ў галовах тых, хто не вучыў гісторыю, не слухаў старэйшых, не быў на сустрэчах з ветэранамі, якіх у наш час было дастаткова шмат», — адзначыў ён.

Аднак праўда, на думку міністра інфармацыі, на нашым баку. «Мы нясём праўду пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны, аб той трагедыі, якая была на нашай зямлі, аб тых 260 месцах, дзе, як у «Шталагу-352», падвяргаліся жорсткім катаванням, знішчэнню грамадзяне Савецкага Саюза, жыхары Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, прызваныя салдаты і афіцэры для службы ў Чырвонай Арміі, — канстатаваў ён. — Мы як журналісты маем магчымасць дзякуючы нашай творчасці, руплівай працы ствараць дакументальныя фільмы, літаратурныя творы, каб і нашы нашчадкі памяталі тую праўду і данасілі яе да сваіх дзяцей. Толькі так, напэўна, гэтая карычневая чума ў чарговы раз не зможа падняць галаву і прыйсці на нашу зямлю».

**Паводле БелТА.**

# ЖЫЦЬ І ПОМНІЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На ўрачыстае мерапрыемства сабралася шмат людзей — прадстаўнікі ўлады і дыпламатычных місій, грамадскіх арганізацый, вайскоўцы, ветэраны, моладзь. Імпрэза пачалася з ускладання кветак да помніка Воіну на цэнтральнай алеі, на якую прысутных запрасіў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.**

Удзельнікаў акцыі прывітаў **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Сяргей ЛАБАДЗІНСКІ:**

— Сёння мы стаім тут схіліўшы галовы, каб ушанаваць герояў вайны і яе ахвяр, даць абяцанне перад іх светлай памяццю берагчы мір, каб перадаць дзецям і ўнукам нашу квітнеючую зямлю. Хачу падзякаваць усім, хто браў удзел у стварэнні Алеі, ва ўвекавечанні памяці, падзякаваць гасцям з Чачні і Інгушэціі за ўдзел у сённяшнім мерапрыемстве.

**Генеральны консул Расійскай Федэрацыі ў Брэсце Алег МУРАШАЎ** гаварыў аб тым, што, на жаль, да гэтай пары мы не ведаем кожнага героя, кожнага абаронцу:

— І тым больш каштоўна, што робіць у Беларусі і Расіі па ўвекавечанні памяці нават праз 80 гадоў. Мы адкрылі Алею Памяці героям, якія першымі прынялі на сябе ўдар фашысцкай арміі. Сумесная работа — добры прыклад для іншых рэгіёнаў, гарадоў-пабрацімаў Брэста, трэба працягваць пошукавую работу, каб і далей ушаноўваць памяць сыноў і дачок нашых народаў.

**Намеснік старшыні Народнага сходу Рэспублікі Інгушэція Руслан ПАРАЎ** выказаў падзяку ўсім людзям, якія зберагаюць памяць:

— Нашы продкі ў той вайне паказалі, наколькі моцны дух савецкага чалавека. Яны тут выстаялі, яны тут перамаглі, хоць многія і не дажылі да слаўнага мая 1945-га.

**Член Грамадскай палаты Расійскай Федэрацыі ад Чачэнскай Рэспублікі Іса САРДАЛАЎ** таксама пачаў са слоў падзякі беларускаму народу за работу па захаванні гістарычнай памяці.

За некалькі мінут да мерапрыемства Іса Алхазуравіч расказаў карэспандэнту «Звязды», як 7 мая 2006 года ў складзе ўрадавай дэлегацыі ён быў у Брэсце і тады ўпершыню агучыў прапанову ўстанавіць памятны знак аб удзеле землякоў у абароне беларускай зямлі: «Я сустрэў тут аднадумцаў. Мы разам прайшлі пэўны шлях да ўстанаўлення памятных пліт, якія сёння можа прачытаць кожны наведвальнік, кожны госць. Мы ведаем, што крэпасць абаранялі прадстаўнікі больш як 30 народаў. І ўсіх іх мы абавязаныя помніць.

**Іван ШУЛЬГА, старшыня Брэсцкага абласнога грамадскага аб'яднання «Гонар і годнасць»,** расказаў:

— Нашу грамадскую арганізацыю ў свой час зарэгістравалі ветэраны ракетных войскаў стратэгічнага прызначэння, яшчэ я ўдзельнічаю ў рабоце ветэранскай арганізацыі Маскоўскага раёна Брэста. І адна, і другая грамадскія арганізацыі працуюць з моладдзю, мы часта бываем у школах, займаемся ў тым ліку інтэрнацыянальным выхаваннем. І, вядома, лічу сваім абавязкам сёння быць тут, дзе ўшаноўваюць памяць воінаў розных нацыянальнасцяў. Адсюль накіроўваюся на пагранічную заставу ў Дамачава, дзе пагранічнік Аляксей Новікаў здзейсніў подзвіг, змагаўся да апошняй кроплі крыві. Сёння яго імя носіць застава. Там мы будзем з вучнямі Дамачаўскай школы. Ім раскажу пра сённяшняе мерапрыемства на Гарнізонных могілках.

**Любоў КУЛІНІНА, настаўніца брэсцкай СШ № 16,** расказала, што была ўчора і на Гарнізонных могілках, і ў маладзёжным патрыятычным цэнтры: «А сёння прыйшлі з калегай пабыць на мерапрыемстве, ушанаваць памяць. Дзень 22 чэрвеня асабліва для Брэста, тут пачыналася вайна. Не толькі нашы героічныя абаронцы крэпасці адчулі яе ўдар, але і звычайныя жыхары — нашы прабабулі, прадзядулі, яны перажылі столькі гора. Мы ўсіх іх павінны памятаць».

### МАБІЛЬНАЯ КАМАНДА ПАМЯЦІ

А ў поўдзень на брэсцкім вакзале сабралася шмат людзей, каб сустрэць «Цягнік Памяці». «З вялікім хваляваннем, з радасцю ўдзельнічаю ў мерапрыемстве вучні Школ міру, — сказала карэспандэнту газеты **старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення Беларускага фонду міру Лідзія РАМАНЮК.** — Дзеці прыйшлі, каб павіншаваць равеснікаў, з гонарам удзельнічаць у сумесным патрыятычным праекце».

Гэты ўнікальны беларуска-расійскі праект упершыню стартаваў летась, таксама 21 чэрвеня, у Брэсце. Пасажырамі цягніка сталі дзве сотні беларускіх і расійскіх школьнікаў, цяпер да іх далучыліся равеснікі з Кыргызстана і Арменіі. Разам яны праедуць па гарадах Беларусі і Расіі. Хлопцы і дзяўчаты наведаюць памятныя мясціны, звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной, сустрэнуцца з ветэранамі, возьмуць удзел у тэматычных сустрэчах, убачаць многія славутасці, культурныя, гістарычныя аб'екты. А галоўнае, пазнаёмяцца, будуць шмат камунікаваць, абменьвацца думкамі і меркаваннямі.

«Цягнік Памяці» не мае аналагаў, раней нічога падобнага не праводзілася. Ідэя нарадзілася падчас адной з сустрэч кіраўнікоў верхніх палат парламентаў дзвюх краін — Старшыні Савета Федэрацыі Расіі Валянціны Матвіенкі і Старшыні Савета Рэспублікі нашай краіны Наталлі Качанавай. Кандыдаты на ўдзел у патрыятычна-асветніцкім праекце прайшлі адбор на конкурснай аснове. І вось Цягнік рушыў у дарогу другі раз.



Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

Адкрыццё Алеі Памяці.

Першы яго пасажыраў прывітаў у Брэсце **член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Віктар ЛІСКОВІЧ:**

— Мы на справе бачым, як рэалізоўваецца маладзёжная палітыка ў нашых краінах. Сёння вельмі важна, што кожны з вас возьме для сябе з гэтага праекта, якія ўражанні вы атрымаеце за 18 дзён падарожжа.

**Намеснік Старшыні Савета Федэрацыі РФ Канстанцін КАСАЧОЎ** пажадаў школьнікам добрай дарогі і цікавых сустрэч:

— Сёлета да нашай агульнай каманды памяці дабавіліся ўдзельнікі з яшчэ дзвюх краін. На ўчарашняй прэс-канферэнцыі ў Маскве ўдзельніца мінулагодняга праекта сказала: «Вядома, я вучыла ў школе гісторыю вайны, вядома, шмат ведала пра Брэсцкую крэпасць, але толькі калі ўпершыню сышла на перон у Брэсце, адчула, што гэта было тут». Вось так і мы ўсе будзем дакранацца душой і сэрцам да гісторыі.

Цікавых, незабыўных уражанняў на брэсцкай зямлі пажадаў удзельнікам праекта **намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім КРАЎЧУК.**

У першыя хвіліны на пероне з карэспандэнтам газеты падзяліліся думкамі ўдзельнікі праекта. Паліна Батурля з Клецка Мінскай вобласці сказала, што яна вельмі рада ўдзельнічаць у паездцы, спадзяецца даведацца шмат новага. Кацярына Шкута з Брэста любіць падарожнічаць наогул, а такое падарожжа абяцае цікавыя сустрэчы. Ігар Кузьмін, школьнік з Ленінградскай вобласці, сказаў, што яго ў дарогу выпраўлялі мама, тата, брат з сястрой, бабуля. І ніхто з іх раней не бываў у Брэсце. Так што ён будзе дзяліцца ўражаннямі найперш з сям'ёй, потым з сябрамі, знаёмымі ў тым ліку і шляхам прамой трансляцыі.

Урачыстая цырымонія старту беларуска-расійскага праекта адбылася ў Брэсцкай крэпасці. На плошчы Цырыманіялаў да ўдзельнікаў акцыі далучыліся юнармейцы Паста Памяці. Дзеці абмяняліся сімваламі акцый, разам усклалі кветкі да Вечнага агню.

Афіцыйная частка сустрэчы «Цягніка Памяці» ў выглядзе дыялогавай пляцоўкі прайшла ў канферэнцзале Брэсцкага аблвыканкама.

Да ўдзельнікаў праекта звярнулася **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА:** «82 гады таму народы былога Савецкага Саюза аб'ядналіся для таго, каб абараніць свабоду і незалежнасць. Яны стаялі плячом да пляча! Гэта той дух і тая гісторыя, якая яднае нас. Гэта тое, што мы павінны перадаваць з пакалення ў пакаленне і захаваць у сваіх сэрцах, каб не дапусціць паўтарэння гэтай жудаснай трагедыі».

«Сёння для вас адкрыта шмат інфармацыйных магчымасцяў. Але вы павінны ведаць сапраўдную праўду. Мы жадаем, каб вы пазналі, убачылі не з інтэрнэту, як мы жывём, захоўваючы гістарычную праўду і памяць, — сказала Наталля Качанава. — Калі казаць пра тое, што свет усё гэта разумее, — то гэта далёка не так. Зусім побач нагнятаецца істэрыя, дзе сцягваецца велізарная колькасць ваеннай тэхнікі, дзе праводзяцца натаўскія вучэнні, — усё гэта нас сур'ёзна насцярожвае. Каб не дапусціць трагедыі, мы павінны памятаць гісторыю».

Намеснік Старшыні Савета Федэрацыі Расіі Канстанцін Касачоў нагадаў прысутным, што ў праекта цудоўная будучыня, ён будзе працягвацца, збіраць новых сяброў і прыхільнікаў: «Гэтае падарожжа — яшчэ і магчымасць пачаць сапраўдную інтэрнацыянальную дружбу і ніколі больш у жыцці адзін аднаго не страчваць».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# Углыб Лядовага кантынента

## Беларускія палярнікі пашыраюць геаграфію даследаванняў у Антарктыцы

**231 дзень! Менавіта столькі доўжылася 15-я Беларуская антарктычная экспедыцыя. І гэта новы рэкорд па працягласці знаходжання беларускіх палярнікаў на шостым кантыненце!**

**З-за складанасцяў з лагістыкай вяртанне даследчыкаў зацягнулася і яны змаглі абняць сваіх родных і блізкіх толькі на мінулым тыдні. Не парушаючы шматгадовую традыцыю, літаральна праз некалькі дзён пасля іх вяртання на радзіму палярнікаў урачыста сустракалі ў Нацыянальнай акадэміі навук. Вітаючы ўдзельнікаў 15-й БАЭ, старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ падкрэсліў, што яны спрацавалі дакладна, зладжана і рэзультатыўна, паспяхова выканалі ўсе ўскладзеныя на іх абавязацельствы.**

«Разам вы — сапраўдная каманда! Сёння ў Антарктыцы забаронена гаспадарчая дзейнасць, але турыстычная — толькі ўзмацняецца. Таму важна паказаць сусветнай супольнасці, што мы з'яўляемся паўнапраўнымі ўдзельнікамі навуковага асваення шостага кантынента, што Беларусь мае ў Антарктыдзе сваю станцыю, якую мы пашыраем і развіваем... Не паспела завяршыцца пятнаццатая экспедыцыя, а мы ўжо пачынаем падрыхтоўку да наступнай, трэба за лета прадумаць навуковую праграму, падрыхтаваць прыборную базу. Гэта ўвогуле ў нас працэс круглагадовы. Мяркую, што па выніках 15-й экспедыцыі трэба падрыхтаваць аналітычныя матэрыялы для кіраўніка нашай дзяржавы», — падзяліўся сваімі думкамі Уладзімір Гусакоў.

«Экспедыцыя насамрэч атрымалася насычаная падзеямі. Былі і складанасці, і форс-мажорныя абставіны. Але хлопцы адпрацавалі на ўсе сто, прадэманстраваўшы найвышэйшы прафесіяналізм, арганізаванасць, самадысцыпліну, узаемавыручку і ўзаемаразуменне. Яны самааддана займаліся навукай, забяспечвалі функцыянаванне нашай станцыі, працягвалі нарошчваць і развіваць яе інфраструктуру. Ва ўсіх, акрамя асноўных, былі і дадатковыя абавязкі. Але нікога не трэба было штурхаць у спіну, кожны ведаў сваю справу і рабіў яе прафесійна! — так ацаніў работу сваёй каманды **начальнік 15-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі Аляксей ГАЙДАШОЎ**. — Мы таксама ўдзячныя сотням спецыялістаў, якія тут, на Вялікай зямлі, дапамагалі нам, падтрымлівалі нас і верылі ў нас! Без іх проста немагчыма было б забяспечыць эфектыўную дзейнасць...»

Адно з галоўных дасягненняў, якое абавязкова ўвойдзе ў гісторыю, — унутрыкантынентальны навуковы паход, ён быў упершыню здзейснены беларускімі даследчыкамі: аддаленне ад палявога лагера склала 188 кіламетраў, а плошча, ахопленая навуковымі даследаваннямі, — 202 квадратныя кіламетры. У складзе паходнай групы было сем чалавек. Яны адправіліся ў дарогу на трох транспартных сродках з прычапнымі ўстройствамі — снегаходзе LYNX, снегабалотаходзе «Бабёр» і шматфункцыянальным Polar-300. Транспарт быў абсталяваны сістэмамі GPS-навігацыі, сродкамі спадарожнікавай і УКХ-сувязі.

«Для абывацеляў гэта быццам бы невялікія лічбы, хтосьці пераадольвае такія адлегласці па дарозе на дачу. Але я растлумачу: да гэтага часу 14 гадоў мы фактычна займаліся даследаваннем дастаткова тэрытарыяльна абмежаванага прыбярэжнага раёна Антарктыкі. Агульная яго плошча складала ад 25 да 30 квадратных кіламетраў. За мінулыя гады быў праведзены неабходны комплекс даследаванняў, і па многіх напрамках навукі ўсё ўжо было зразумела, таму патрабавалася пашырэнне геаграфіі даследаванняў, — падкрэсліў Аляксей Гайдашоў. — Тым больш гэтая лічба сур'ёзная з улікам спецыфікі прыродных і



рэльефных умоў Антарктыкі. Нам давялося пераадолець некалькі ледніковых далін з расколінамі, праводзіліся папярэдняя паветраная і наземная разведкі, перш чым група рухалася наперад, па ходу адбіраліся навуковыя паверхневыя пробы снегу, лёду, замяраліся розныя параметры прыроднага асяроддзя. Агульная працягласць паходу з падрыхтоўкай, выхадам на маршрут і вяртаннем заняла трое сутак без сну і адпачынку».

Палярнікі выконвалі фота- і відэаздымку, вялі электронны запіс апорных пунктаў GPS-трэка даследчага маршруту. Праз кожныя два кіламетры дарогі апорныя пункты маршруту замацоўваліся на мясцовасці рэпернымі маркёрамі з дзяржаўнай сімволікай Беларусі. Ім удалося дасягнуць намечанага канцавога пункта маршруту — горнага масіву DSF, які размешчаны ў глыбіні кантынента ў каардынатах найвышэйшага пункта (1451 м) над узроўнем мора. На піку горнага масіву былі ўзняты Дзяржаўны сцяг Беларусі.

«Мы здзейснілі проста гіганцкі крок наперад у плане пашырэння геаграфіі нашых даследаванняў, — адзначыў Аляксей Гайдашоў. — Паверце, што нямногія нацыянальныя экспедыцыі, якія працуюць ужо дзясяткі гадоў у Антарктыцы, практыкуюць навуковыя паходы. Гэта звязана з пэўнымі праблемамі ў лагістыцы, неабходнасцю займацца пытаннямі забеспячэння бяспекі ўдзельнікаў такіх паходаў, транспартнымі пытаннямі і гэтак далей. А мы тое здзейснілі! У працэсе наступных экспедыцый плануем працягнуць практыку ўнутрыкантынентальных навуковых паходаў. У перспектыве плошча навуковых даследаванняў можа пашырыцца да тысячы кіламетраў».

Як адзначыў начальнік экспедыцыі, метэаралагічныя і кліматычныя ўмовы апошняга сезона былі ўмерана халоднымі: «Гэта вялікі плюс для нас. Не было багатага снегарастання і, адпаведна, бурных ледніковых патокаў, якія ўяўляюць небяспеку, не было абледзянелых схілаў, па якіх складана паднімацца, і не выпадала вялікай колькасці снегу, таму снежныя заносы, цяжкасці пры перасоўваннях, небяспека схаваных пад снегам расколін у сезоне былі мінімізаваныя».

Непасрэдна на Лядовым кантыненце беларускія палярнікі прабылі паўгода. Затое ім удалося апрабаваць абсталяванне, тэхніку і інфраструктуру станцыі ў найскладанейшых зімовых умовах (іх эвакуіравалі толькі 1 мая). Гэта стала дадатковым выпрабаваннем перад правядзеннем круглагадовай камандзіроўкі, якая можа ажыццявіцца ўжо ў найбліжэйшай перспектыве. Але пакуль аднадушнага меркавання наконт мэтазгоднасці такіх экспедыцый няма.

«Дадзенае рашэнне павінна прымацца кіраўніцтвам краіны і Нацыянальнай акадэміі навук, — падкрэслівае Аляксей Гайдашоў. — З нашага боку магу запэўніць, што Беларуская палярная станцыя ў плане гатоўнасці сістэм яе жыццезабеспячэння цалкам падрыхтаваная. Высокапрафесійнымі кадрамі мы таксама забяспечаны. За мінулыя гады стварылі сур'ёзны кадравы рэзерв. На кожную пасаду ў экспедыцыі ў нас прэтэндуе па тры-чатыры чалавекі».

Трэба патлумачыць, што зімоўка — асаблівы выпадак. Восем месяцаў у годзе аказаць дапамогу ў Антарктыцы ніхто не зможа. Караблі і самалёты могуць трапіць туды толькі ў кастрычніку-лістападзе і ў сакавіку-красавіку. На працягу сезоннай экспедыцыі ў выпадку нейкіх форс-мажорных абставін можна вырашыць пытанне эвакуацыі хворага, даставіць запчасткі, калі нешта выйшла са строю. Але калі пачынаюцца зімовачныя мерапрыемствы, разлічваць можна толькі на тое, што прывезлі, і на людзей, якія побач. На зімовы перыяд патрабуецца фіксаваны састаў, кампактны, мінімальна неабходны з пункту гледжання эфектыўнасці выконваемых работ і бяспекі. Гэта тэхнічныя спецыялісты па жыццезабеспячэнні і навуковыя супрацоўнікі для выканання круглагадовых навуковых праграм.

— Трэба выпрацаваць аптымальнае рашэнне для краіны, — лічыць старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Уладзімір Гусакоў. — Давайце думаць, а што гэта дасць нашай краіне і наколькі істотная будзе розніца ў выніках сезоннай і круглагадовай экспедыцыі? Плюс усё ж такі не кожны рашыцца адправіцца ў палярную экспедыцыю на цэлы год... Тут важнае не толькі жаданне, але і здароўе, і псіхалагічная сумяшчальнасць членаў экспедыцыі.

**Акадэмік Уладзімір ЛОГІНАЎ**, які быў ідэйным натхняльнікам і ініцыятарам беларускіх антарктычных праграм, таксама асцярожна выказаўся наконт круглагадовых экспедыцый: «Лічу, што экспедыцыя з гадавой цыклічнасцю патрэбная толькі тады, калі ёсць навуковыя задачы, якія патрабуюць вырашэння ў гадавым цыкле даследаванняў. Да таго ж такія экспедыцыі могуць дазволіць сабе, як правіла, толькі вельмі заможныя краіны, — заўважыў ён. — А вось над чым трэба папрацаваць, дык гэта над абагульненнем таго, што было зроблена на працягу пятнаццаці беларускіх экспедыцый. Патрабуецца сур'ёзная сістэматызацыя навуковых вынікаў, і ўсё павінна быць выкладзена на паперы...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Рэспубліканскага цэнтра палярных даследаванняў.**


Учреждение образования
«Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой»

ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ

за счет средств республиканского бюджета на 2023 год
по следующим специальностям:

| Шифр и наименование специальности | Количество мест | | |
|---|---|---|---|
| | дневная | заочная | соискательство |
| 01.04.13 – Электрофизика, электрофизические установки | - | - | 1 |
| 05.17.07 – Химическая технология топлива и высокоэнергетических веществ | 1 | - | - |
| 05.22.10 – Эксплуатация автомобильного транспорта | 1 | - | - |
| 05.23.01 – Строительные конструкции, здания и сооружения | - | 1 | - |
| 05.23.05 – Строительные материалы и изделия | 1 | - | - |
| 05.26.01 – Охрана труда (по отраслям) | - | - | 1 |
| 10.01.03 – Литература народов стран зарубежья (с указанием конкретной литературы) | 2 | - | - |
| 25.02.07 – Строительство и эксплуатация нефтегазопроводов, баз и хранилищ | 2 | - | - |
| ИТОГО: | 7 | 1 | 2 |




ПРИЕМ ДОКУМЕНТОВ для поступления в аспирантуру осуществляется
с 1 августа по 30 сентября 2023 года

Телефон для справок
8 (0214) 59-95-64

УНП 300220696

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
22 ЧЭРВЕНЯ 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 12 (15956)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Таццяна КУПРЫЯНЕЦ:
# «Тэма вайны чырвонай ніткай праходзіць праз маю творчасць»



**Каб адчуць, да якой будучыні ідзе Беларусь, трэба глядзець на яе моладзь: што яе цікавіць, якія каштоўнасці для яе істотныя? Бо самая яркая і рамантычная пара жыцця шмат у чым закладвае арыенціры і прынцыпы, зыходзячы з якіх чалавек будзе будаваць свой лёс і вызначаць шлях краіны. Сённяшняя суразмоўніца Таццяна Купрыянец — дзяўчына надзвычай неардынарная. Напэўна, такіх адзінкі. Але з такіх адзінак утвараюцца дзясяткі ці сотні, калі ўзяць пад увагу актыўнасць Таццяны ў рабоце з аднагодкамі ды дзецьмі. Таму цікава зразумець: што яна носіць у душы? Пераможца рэспубліканскіх і міжнародных літаратурных конкурсаў, уладальніца прэміі «БелБрэнд-2016» у намінацыі «Паэзія» па выніках конкурсу «Таленты Беларусі»... А яшчэ яна была лаўрэатам прэміі міністра абароны Беларусі ў галіне літаратуры і мастацтва ў намінацыі «Творы прозы і паэзіі» (за 2018 і 2019 гады)... Усё гэта дзіўна, асабліва таму, што скончыла Таццяна фізічны факультэт БДУ... Як фізік спалучаецца з лірыкам у адной асобе?**

— Яшчэ ў школе я спрабавала нешта пісаць, але не надавала сур'ёзнага значэння таму, што атрымлівалася. А калі вучылася на чацвёртым курсе, выпадкова ўбачыла аб'яву аб конкурсе «Славянскі калейдаскоп». Вырашыла паўдзельнічаць. У мяне было некалькі вершаў, якія не сорамна даслаць на конкурс. І раптам мяне запрасілі на цырымонію ўзнагароджання... А калі пры Фундаментальнай бібліятэцы БДУ стварыўся Клуб аматараў мастацкага слова «КЛУмБа», я там, можна сказаць, прапісалася. Успрымаю гэтых людзей як сваю другую сям'ю. Мы праводзілі літаратурныя мерапрыемствы і дзяліліся адзін з адным сваімі вершамі, досведам. Многія ўдзельнікі сталі членамі Саюза пісьменнікаў Беларусі. І мяне заўважылі: неўзабаве Міхаіл Паўлавіч Пазнякоў, старшыня Мінскага гарадскога аддзялення, прапанаваў стаць сябрам Саюза пісьменнікаў Беларусі. Падштурхнулі выдаць першы зборнік, у якім каля 40 вершаў, ён называўся «Водгукі памяці». Так пачалося маё літаратурнае жыццё, нягледзячы на тое, што вучылася я на фізфаку БДУ.

***— А ў жыцці вы рэалізаваліся ў якасці фізіка ці ў якасці лірыка?***

— З аднаго боку, мне падабаецца мая спецыяльнасць — фізіка, матэматыка. Але я цяпер з ёй не звязаная. А называць сябе паэтам, з майго боку, было б даволі смела. Хутчэй, я проста гэтым жыву. Але ў мяне ёсць яшчэ адно захапленне — ваенная справа. Так атрымалася, што ў 2021 годзе я паехала на фестываль «Александрыя збірае сяброў». Палатка Саюза пісьменнікаў Беларусі стаяла побач з палаткай клуба «Будзем памятаць». Мы пазнаёміліся, а праз некаторы час я прыйшла ў клуб ваенна-гістарычнай рэканструкцыі, на базе якога ўзнікла гісторыка-патрыятычнае грамадскае аб'яднанне «Будзем памятаць». Я адносна нядаўна ўлілася ў гэтую сферу, летась упершыню брала ўдзел у рэканструкцыі — быў шквал эмоцый. Усім вельмі раю адчуць сябе на месцы байцоў, якія баранілі нашу зямлю. Я бяру актыўны ўдзел у розных праектах аб'яднання, у асноўным па тэме Вялікай Айчыннай вайны. Праводжу так званыя паэтычныя ўрокі мужнасці ў школах, бібліятэках. Не толькі чытаю свае вершы, але імкнуся гутарыць з дзецьмі аб тым, што было падчас Вялікай Айчыннай. У мяне ёсць ваенная форма тых часоў, і калі прыходжу ў ёй да дзяцей, дык зусім іншае ўспрыманне. У іх у памяці застанецца гэтая выява, і, можа быць, яны задумаюцца аб чымсьці.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Вехі гісторыі

## «МАЛАДОСЦЬ. ПРАЦА. АДЗІНСТВА: 60 ГАДОЎ НА КАРЫСЦЬ КРАІНЫ»

**Сёлета Беларускім студэнцкім атрадам спаўняецца 60 гадоў. З такой нагоды БРСМ запрасіў журналістаў на прэс-мерапрыемства, прысвечанае юбілею, а таксама рэспубліканскаму адкрыццю трэцяга працоўнага семестра 2023 года.**

Занятасць — адзін з прыярытэтаў сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы. Арганічнай часткай сістэмы працаўладкавання ў нашай краіне сталі студэнцкія атрады БРСМ, якія нясуць у сабе працоўны і выхаваўчы зарад. Яны не проста даюць маладому чалавеку магчымасць зарабіць свае першыя грошы, але і дазваляюць зарыентавацца прафесійна, атрымаць першыя працоўныя навыкі і дадатковую спецыяльнасць.

Для многіх хлопцаў і дзяўчат студэнцкі атрад становіцца школай дарослага жыцця і судакрананнем з непарушнымі каштоўнасцямі і духоўна-маральнымі ідэаламі: ініцыятыўнасцю і самастойнасцю, камандным духам і сапраўдным сяброўствам, перамогамі і перажываннямі, святамі і буднямі. Праект перадае традыцыі дзелавых і чалавечых узаемаадносін, фарміруе патрыётаў і грамадзян сваёй краіны.

Дзякуючы асабістай увазе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь наша краіна стала першай на постсавецкай прасторы, у якой на дзяржаўным узроўні студэнцкія атрады атрымалі заканадаўчую падтрымку і здолелі заваяваць аўтарытэт сярод моладзі.

Студатрадаўскі рух — адзін з вядучых напрамкаў дзейнасці Саюза моладзі. Пачынаючы з 2003 года, у складзе студэнцкіх атрадаў пад патранатам БРСМ працаўладкавана больш за 741 тысячу юнакоў і дзяўчат — студэнтаў, навучэнцаў сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі, школьнікаў.

Як было сказана падчас мерапрыемства, у Год міру і стваральнай працы і 60-годдзя Беларускіх студэнцкіх атрадаў асаблівая ўвага будзе ўдзелена фарміраванню ідэалогіі студатрадаўскага руху (каштоўнасцям, традыцыям, культуры руху) і іміджу студэнцкіх атрадаў як надзейнага і кваліфікаванага партнёра наймальнікаў.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

Шчаслівага шляху!

# Той самы значны дзень

## Выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі чакае рэспубліканскі баль

**Да права прадстаўляць на ім свае рэгіёны найлепшыя ўчарашнія студэнты прайшлі доўгі шлях. Ён быў напоўнены стараннай вучобай, валанцёрствам, навуковымі і спартыўнымі дасягненнямі, актыўнай грамадзянскай пазіцыяй. Яны сапраўды заслужылі права быць уганараванымі запрашэннямі на гэтае свята. Наперадзе выпускнікоў чакае новы жыццёвы этап, падчас якога, упэўнены, маладыя людзі праявяць сябе гэтак жа амбіцыйна, крэатыўна, творча, як і падчас сваёй вучобы. З пачаткоўцаў, якія зусім скора ўладкуюцца на першыя працоўныя месцы, вырастуць сапраўдныя прафесіяналы сваёй справы, таленавітыя кіраўнікі і арганізатары. Гэта ўсё абавязкова будзе! А пакуль... А пакуль гэтым сувязным звяном паміж днём учарашнім і днём заўтрашнім будзе рэспубліканскі баль выпускнікоў ВНУ. Той самы значны дзень у жыцці... Давайце пазнаёмімся з некаторымі ўдзельнікамі свята.**

## З ДЫПЛОМАМ ЭКАНАМІСТА І МАРАМІ ПРА ЖУРНАЛІСТЫКУ



**Выпускніца Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі Яна ДАЎБЕНКА — чалавек разнастайных інтарэсаў. Прычым калі нешта робіць, то грунтоўна. Родную альма-матар па спецыяльнасці «Сусветная эканоміка» скончыла з чырвоным дыпломам. Яе партрэт упрыгожвае Горацкую раённую Дошку Пашаны, па выніках мінулага года яна з'яўляецца лаўрэатам спецыяльнай прэміі Магілёўскага аблвыканкама ў намінацыі «Адукацыя». А яшчэ развіваецца творча, спявае ў народнай эстраднай студыі акадэміі «Золак». У складзе калектыву прымала ўдзел у шматлікіх конкурсах, канцэртах і святах. Выступала на злёце перадавікоў, нядаўна прымала ўдзел у адборачным туры рэспубліканскага праекта «Зорны шлях». Плюс Яна — актыўная ўдзельніца грамадскага жыцця. І калі толькі ўсё паспявае?**

— Мне ўсё гэта цікава, таму і атрымліваецца, — усміхаецца дзяўчына. — Калі паступіла ў акадэмію, першы год займалася выключна вучобай. Калі зразумела, што ёсць час і на іншае, знайшла сабе заняткі па інтарэсах. У музычнай студыі займаюся, таму што ёсць база, падчас вучобы ў школе скончыла музычную школу.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

# З ДЫПЛОМАМ ЭКАНАМІСТА І МАРАМІ ПРА ЖУРНАЛІСТЫКУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Яна актыўна ўдзельнічае ў культурна-масавых мерапрыемствах, грамадскай дзейнасці. Грамадская работа яе толькі натхняе, падабаецца рабіць нешта карыснае і менавіта сумесна.

Патэнцыял таленавітай дзяўчыны ў акадэміі ацанілі па заслугах. Па выніках мінулага года яна стала найлепшым студэнтам гэтай установы. Цікава, што родам суразмоўніца з Маладзечна, Мінск, здаецца, бліжэй, а яна паехала вучыцца ў Горкі, ды яшчэ платна.

— Некаторыя не хаваюць здзіўлення, калі даведваюцца, што вучуся платна, пры гэтым атрымліваю спецыяльную стыпендыю і маё імя занесена на Дошку пашаны, — рэзюмуе суразмоўніца. — Але чатыры гады таму, калі паступала ў акадэмію, гэта была зусім новая спецыяльнасць і вучыцца на яе можна было выключна платна. На бюджэт сталі набіраць толькі летась. Але я за ўвесь час вучобы ні разу не пашкадавала, што абрала акадэмію. Ведала, куды іду, мае родныя тут вучыліся і расказвалі, наколькі моцная база і выкладчыкі. А цяпер і сама ў гэтым пераканалася. Тут створаны ўсе ўмовы для развіцця. Горкі мне і адукацыю далі, і навучылі шмат чаму іншаму, што спатрэбіцца ў жыцці. Для студэнтаў існуе шмат заахвочвальных стымулаў, напрыклад, зніжкі па аплаце за вучобу. Тут я атрымала дастаткова добрыя веды па англійскай і нямецкай мовах. Асаблівасць нашай спецыяльнасці ў тым, што выпускнікі маюць магчымасць працаваць у самых розных галінах.

«Запрашэнне на рэспубліканскі баль выпускнікоў ВНУ — вялікая адказнасць», — лічыць дзяўчына. І гэта таксама натхняе на актыўную дзейнасць у будучыні. Яна глядзіць у яе з упэўненасцю, бо той багаж ведаў, які дала акадэмія, дапаможа сябе рэалізаваць дзе заўгодна. Ёй, напрыклад, бліжэй журналістыка. Пры акадэміі існуе прэс-сектар, дзе Яна таксама была задзейнічана. Навіны, рэпартажы, нарысы — для дзяўчыны з рознабаковымі інтарэсамі самая што ні на ёсць родная стыхія. За творчасцю Яны назіраюць у сацсетках шматлікія чытачы, сярод якіх шмат прыхільнікаў. А з акадэміяй яна пакуль таксама развітвацца не збіраецца. Завочна вучыцца ў Вышэйшай школе аграбізнесу на прававеда — ёсць такая магчымасць для студэнтаў з добрай паспяховасцю. Другі дыплом акадэміі Яна атрымае ўжо праз паўтара года.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# «УНІВЕРСІТЭТ — ГЭТА АДУКАЦЫЙНА-ТВОРЧЫ КЛАСТАР»

**У ліку тых, хто будзе прадстаўляць на рэспубліканскім балі выпускнікоў Віцебскую вобласць, — палачанін Мікіта САВЕТНІКАЎ.**



Малады чалавек нарадзіўся ў самым старажытным горадзе Беларусі, а вось дзяцінства і юнацтва правёў у самым маладым — Наваполацку. У 2019 годзе з адзнакай скончыў тут гімназію № 2 і пачаў аналізаваць спецыяльнасці вышэйшых навучальных устаноў краіны, каб звязаць прафесію з любімымі школьнымі прадметамі — матэматыкай, фізікай, хіміяй. Да апошняй навукі Мікіта цягнуўся больш: ён неаднойчы станавіўся пераможцам гарадскіх і абласных алімпіяд, удзельнічаў і ў рэспубліканскім туры. Свой прафесійны выбар зрабіў у бок спецыяльнасці, якую можна было атрымаць толькі ў адной ВНУ Беларусі — Полацкім дзяржаўным універсітэце імя Е. Полацкай, — «Хімічная тэхналогія прыродных энерганосьбітаў і вугляродных матэрыялаў», якая цяпер называецца «Перапрацоўка нафты і газу і прамысловы арганічны сінтэз».

«Гэтыя чатыры гады былі насычаныя і запамінальныя, менавіта яны загартавалі мяне, выхавалі асобу. Я рады, што акрамя вучобы ў сценах альма-матэр была магчымасць рэалізаваць сябе ў творчасці: асвоіў сферы прамоўніцкага майстэрства, харэаграфіі, КВЗ, нават распрацаваў бізнес-праект. Разам з гэтым актыўна займаўся навуковай дзейнасцю: удзельнічаў у канферэнцыях, двойчы атрымліваў другую катэгорыю на рэспубліканскім конкурсе навукова-даследчых работ. Сёння ўніверсітэт — адукацыйна-творчы кластар для ўсебаковага развіцця», — адзначае Мікіта.

Пасля атрымання дыплома малады чалавек плануе паступаць у магістратуру, сумяшчаць навуковую дзейнасць з практычным асваеннем спецыяльнасці на нафтахімічным прадпрыемстве. Навіна аб тым, што ён удастоены гонару прадстаўляць ПДУ на рэспубліканскім балі выпускнікоў, вельмі абрадавала юнака, падвяла ўрачыстую рысу пад заканчэннем першай ступені вышэйшай адукацыі. А ўсім абітурыентам, каму неабыякавая хімія і свет палімераў, раіць не раздумваючы абіраць Полацкі дзяржаўны універсітэт імя Е. Полацкай.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

# ДА ЗАКАНЧЭННЯ ВНУ — ДВА ДЗЯСЯТКІ ПУБЛІКАЦЫЙ

**Ілья КЛІМЯНКОЎ — паспяховы выпускнік факультэта эканомікі і права Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Родам хлопец з Баранавічаў. Чатыры гады таму паспяхова скончыў СШ № 18 і паступіў у ВНУ роднага горада. Увесь час вучыўся з сярэднім балам больш за «9», такім чынам упэўнена падышоў да дыплома з адзнакай.**




Літаральна з першага курса Ілья захапіўся навуковай работай. І да выпуску ў хлопца ўжо налічваецца два дзясяткі публікацый у розных навуковых выданнях па абранай ім спецыяльнасці — «Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт». Практыку і стажыроўкі студэнт праходзіў у тым ліку ў структурах, якія займаюцца фінансавай аналітыкай, фінансавымі расследаваннямі. З гэтым звязана і будучая работа Ільі Клімянкова. Летась, дарэчы, студэнт стаў стыпендыятам спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі.

Варта сказаць, што Ілья мае як свае асабістыя напрацоўкі, так і работы ў суаўтарстве. Напрыклад, іх сумесны з першым прарэктарам універсітэта Уладзімірам Клімуком праект стаў фіналістам рэспубліканскага конкурсу інавацыйных праектаў. Распрацоўка ўяўляе сабой платформу для дапамогі ў рэалізацыі маладзёжных ініцыятыў.

— Сёння сярод маіх равеснікаў нямала крэатыўных хлопцаў і дзяўчат, — гаворыць Ілья. — Яны маюць цікавыя ідэі, але не маюць дакладнага плана па іх увасабленні ў жыццё. Некаторыя не ведаюць нават з чаго пачынаць. На нашай платформе можна знайсці не толькі рэкамендацыі, але і пэўную падтрымку-суправаджэнне на шляху ад ідэі да яе рэалізацыі. Асобныя ўжо скарысталіся такой магчымасцю.

«І яшчэ я хачу сказаць, — працягвае выпускнік, — што ўсім, чаго дабіўся, я абавязаны свайму універсітэту, маім выкладчыкам, якія дапамаглі раскрыць мой творчы патэнцыял, запаліць цікаўнасць да навуковай работы. Цвёрда перакананы, што добрую адукацыю можна атрымаць не толькі ў сталіцы. Трэба мець жаданне, ставіць перад сабой мэты і ўпарта ісці да іх дасягнення».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# «СПЫТАЛА Б У ПРЭЗІДЭНТА ПРА ЯГО ВЫПУСКНЫ»

**Валерыя НОВІК — выпускніца Мазырскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна, стыпендыят Прэзідэнцкага фонду па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.**



Дзяўчына — выпускніца філалагічнага факультэта. Атрымлівае спецыяльнасць настаўніка замежных моў. Яе спецыялізацыя — выкладанне англійскай і нямецкай. Студэнтка на працягу ўсяго навучання прымала актыўны ўдзел у навуковым і творчым жыцці роднага ўніверсітэта. Валерыя — аўтар артыкулаў і публікацый міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцый, а таксама работ для творчых конкурсаў.

— У сваіх навуковых працах аналізавала літаратурныя творы: даследавала, параўноўвала выкарыстанне фразеалагічных адзінак у розных мовах. Упэўнена, што гэты вопыт будзе карысны і ў маёй далейшай рабоце, — расказала Валерыя Новік.

Дзяўчына дадала, што ўжо рыхтуецца адправіцца па размеркаванні на першае месца працы. Яна стане настаўнікам англійскай мовы ў мазырскай сярэдняй школе № 11.

— Мая сям'я, педагогі вельмі за рады мяне. Бо ўпершыню мне выпала магчымасць стаць госцяй урачыстага вечара для студэнтаў з удзелам Прэзідэнта Беларусі. Гэта гонар для мяне. Я сама родам з Мазырскага раёна. Думаю, што такія сустрэчы дапамагаюць нам, маладым людзям з рэгіёнаў, у тым ліку яшчэ больш паверыць у свае сілы, — падзялілася выпускніца Мазырскага дзяржуніверсітэта імя І. П. Шамякіна.

Калі прадставіцца магчымасць задаць пытанне Прэзідэнту, дзяўчыне было б цікава дазнацца аб яго ўспамінах пра студэнцкія гады і выпускны вечар.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# «БАЛЬ — АПАФЕОЗ МАЙГО СТУДЭНЦКАГА ЖЫЦЦЯ»

**За чатыры гады навучання на юрыдычным факультэце ГрДУ імя Я. Купалы Вера МАРТЫНАВА паспела многае. Яна зарэкамендавала сябе ініцыятыўнай і таленавітай студэнткай. Пры паспяховасці ў 9,71 бала займаецца навуковай дзейнасцю, прамоўніцкім майстэрствам, іграе на трох музычных інструментах і знаходзіць асалоду ў жывапісе. Пры гэтым у кожным напрамку Вера атрымлівае міжнароднае прызнанне. Аб чым сведчаць перамогі ў шматлікіх алімпіядах і конкурсах.**



Выпускніца з удзячнасцю ўспамінае свой студэнцкі шлях. Яна лічыць, што вышэйшая адукацыя сёння адпавядае запытам часу. У ГрДУ, на яе думку, ёсць комплексныя магчымасці для рэалізацыі сваіх здольнасцяў. Праводзіцца работа па развіцці талентаў і прафесійнай матывацыі студэнтаў.

Падчас вучобы на юрыдычным факультэце Вера абрала спецыяльнасць «Мытная справа». Неаднойчы праходзіла практыку на пунктах пропуску Гродзенскай рэгіянальнай мытні, куды і атрымала размеркаванне. Падчас вучобы здольная студэнтка, адзіная ў краіне, была залічана ў перспектыўны кадравы рэзерв Дзяржаўнага мытнага камітэта. Дарэчы, Вера не супраць кар'ернага росту і мае намер паступіць у магістратуру па спецыяльнасці «Пракурорска-следчая дзейнасць».

Між іншым, уражвае яе творчы патэнцыял. Аказваецца, Вера знаходзіць час займацца вакалам і музыкай, засвоіла адразу тры інструменты — віяланчэль, фартэпіяна і гітару. Любіць маляваць. Гэты талент адкрыла ў сябе з дзяцінства, з той пары для яе творчасць — найлепшы адпачынак. Пры гэтым на міжнародных конкурсах малюнкаў неаднаразова была пераможцай.

Згодна з рэйтынгам, дзе ацэньваецца вучэбная, навуковая і грамадская дзейнасць, Вера Мартынава стала першай на сваім факультэце і ўвайшла ў склад студэнцкай групы, якая будзе прадстаўляць ГрДУ імя Я. Купалы ў Мінску на рэспубліканскім свяце выпускнікоў.

— Настрой хвалюючы, — апісвае свой стан гродзенская выпускніца. — Многае, што будзе адбывацца падчас свята, трымаецца ў сакрэце. Усе чакаюць выступлення кіраўніка дзяржавы. Мне давялося прысутнічаць на Адкрытым уроку Прэзідэнта, які адбыўся на пачатку навучальнага года, і гэта была вельмі памятная падзея. І вось мне зноў пашанцавала. Урачыстасць стане прыемным завяршальным акордам майго студэнцкага жыцця.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

*Бачыць мэту*

# СТУДАТРАДЫ ДА ПРАЦЫ ГАТОВЫЯ!



Фота з сайта БРСМ.

**Афіцыйная ўрачыстая цырымонія рэспубліканскага адкрыцця трэцяга працоўнага семестра запланавана на 24 чэрвеня — напярэдадні Дня моладзі і студэнцтва.**

Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў БРСМ падвёў прамежкавы вынік работы з пачатку года. На працу ў іх падчас промапраекта «Выбіраем студатрад» падалі заяўкі 32,5 тысячы чалавек. Заключана амаль 900 дагавораў на больш чым 15 тысяч байцоў. У перыяд з 1 студзеня да 1 чэрвеня ў рамках круглагадовай працоўнай занятасці ў складзе 324 атрадаў працаўладкаваны каля 5 тысяч хлопцаў і дзяўчат, што ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 1,2 тысячы чалавек больш.

Гэта добрая дынаміка, адзначаюць у Рэспубліканскім штабе студэнцкіх атрадаў БРСМ. Разам з тым работа па запісе ў атрады прадоўжыцца і летам — у пераліку прымаючых арганізацый, аб'ектаў, відаў работ і колькасці працоўных месцаў для ўдзельнікаў студэнцкіх атрадаў, зацверджаны райгарвыканкамамі, адміністрацыямі раёнаў Мінска, унесена 1270 аб'ектаў на 38 446 працоўных месцаў.

У гэтым годзе статус абласной (Мінскай гарадской) маладзёжнай будоўлі прысвоены будаўніцтву палiклінікі ў новым мікраёне Оршы, аб'ектам будаўніцтва «Рэканструкцыя мемарыяльнага комплексу вязням Азарыцкага лагера смерці ў Калінкавіцкім раёне Гомельскай вобласці» і «Цэнтр гульнявых відаў спорту ў г. Светлагорску. 1-я чарга — Лядовы палац», рэканструкцыі комплексу будынкаў Гарадской клінічнай бальніцы № 3 Гродна пад Гродзенскі абласны клінічны анкалагічны дыспансер.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Даніна пашаны*

# Будучыя экскурсаводы ў «Хатыні»

**БДПУ падпісаў дагавор аб супрацоўніцтве з дзяржаўным мемарыяльным комплексам.**

Навучальная ўстанова па ўзгадненні з Мінскім абласным выканаўчым камітэтам з мая гэтага года пачала супрацоўніцтва з «Хатынню» ў мэтах павышэння эфектыўнасці выхаваўчай і ідэалагічнай работы з моладдзю ў фармаце падрыхтоўкі студэнтаў універсітэта для работы экскурсаводамі комплексу.

Па дамоўленасці з яго кіраўніцтвам распачата рэалізацыя сумеснага грамадзянска-патрыятычнага праекта «Захоўваем гістарычную памяць у імя будучыні». Яго мэтай з'яўляецца захаванне гістарычнай праўды аб подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, увекавечанне памяці ахвяр генацыду, выкарыстанне гісторыка-культурнай спадчыны для грамадзянска-патрыятычнага выхавання навучэнцаў і студэнцкай моладзі.

Прадугледжваецца, што ў рамках падпісанага дагавора аб супрацоўніцтве ў галіне грамадзянска-патрыятычнага выхавання і духоўна-маральнага развіцця навучэнцаў і студэнцкай моладзі паміж БДПУ і мемарыяльным комплексам «Хатынь» будзе рэалізаваны шэраг форм супрацоўніцтва.

У прыватнасці, гэта навучанне студэнтаў-будучых экскурсаводаў арганізацыі і правядзенню экскурсій на тэрыторыі мемарыяла, выкананне курсавых, дыпломных работ, магістарскіх дысертацый на базе і (або) па заказе мемарыяла. Таксама гаворка ідзе аб правядзенні гісторыка-краязнаўчай практыкі студэнтаў БДПУ на базе мемарыяла, арганізацыю экскурсій студэнтамі-практыкантамі для студэнтаў БДПУ, навучэнцаў педагагічных класаў, замежных грамадзян на тэрыторыі мемарыяла і інш.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Новыя старты*

# «Разам супраць карупцыі!»

**Пад такой назвай на Беларускай чыгунцы пачаўся маладзёжны конкурс сацыяльнай антыкарупцыйнай рэкламы. Ён праводзіцца ў мэтах прыцягнення моладзі беларускай магістралі да ўдзелу ў прафілактыцы карупцыі.**

Удзельнікамі конкурсу могуць стаць працаўнікі Беларускай чыгункі ва ўзросце да 35 гадоў. Конкурс праводзіцца ў дзвюх намінацыях: «Найлепшы плакат» і «Найлепшы відэаролік». У кожнай з іх дапускаецца прадстаўленне не больш за тры работы ад аднаго аўтара (фізічнай асобы або творчага калектыву). Матэрыялы на конкурс прымаюцца да 1 верасня, інфармуе прэс-цэнтр магістралі.

Пры ацэнцы конкурсных работ будуць улічвацца: адпаведнасць іх заяўленай тэматыцы, тэхнічным патрабаванням і абмежаванням, указаным у Палажэнні аб правядзенні конкурсу, адсутнасць плагіяту, аргументаванасць і глыбіня раскрыцця тэмы, крэатыўнасць, навізна ідэі і якасць выканання работы, патэнцыяльная магчымасць далейшага выкарыстання ў якасці сацыяльнай антыкарупцыйнай рэкламы, мастацка-эмацыянальнае ўздзеянне, адлюстраванне ўласнага стаўлення да абранай тэмы, арыгінальнасць задумы, творчы характар выканання, інфарматыўнасць і якасць афармлення.

Найлепшыя работы будуць накіраваны для ўдзелу ў Міжнародным маладзёжным конкурсе сацыяльнай рэкламы «Разам супраць карупцыі!», арганізатарам якога з'яўляецца Генеральная пракуратура Расійскай Федэрацыі, суарганізатарамі — Генеральныя пракуратуры Рэспублікі Арменія, Рэспублікі Беларусь, Кыргызскай Рэспублікі, Агенцтва Рэспублікі Казахстан па справах дзяржаўнай службы і карупцыі, Агенцтва па дзяржаўным фінансавым кантролі і барацьбе з карупцыяй Рэспублікі Таджыкістан.

Аўтары і суаўтары конкурсных работ таксама могуць самастойна ўдзельнічаць у Міжнародным конкурсе ў адпаведнасці з яго правіламі правядзення (https://www.anticorruption.life).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Ведай нашых!*

# НАЙЛЕПШЫЯ Ў СФЕРЫ НАВУК АБ ЗЯМЛІ

**Шэсць студэнтаў БДУ сталі прызёрамі Міжнароднай студэнцкай алімпіяды па геаграфіі «Terra Incognita». Усяго вызначылі 10 пераможцаў.**

Абсалютным лідарам у спаборніцтве прызнана першакурсніца факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі (ФГіГ) БДУ Юлія Мацель. Другое і трэцяе месцы таксама заваявалі студэнты ФГіГ: трэцякурсніца Ульяна Рондак і першакурснік Мікіта Віхараў. На чацвёртым месцы размясціўся трэцякурснік Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта (СПбДУ) Даніл Акулаў. Пятым па колькасці балаў стаў першакурснік Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна Ягор Цыбульскі. Узнагароду за шостае месца атрымала магістрантка СПбДУ Аліса Кочатава. Сёмае і восьмае месцы занялі студэнты ФГіГ БДУ: трэцякурсніца Ірына Крывёнак і чацвёртакурсніца Станіслава Драбянок адпаведна. Дзявятай стала першакурсніца СПбГУ Дар'я Ігнаценка. Закрыў дзясятку найлепшых удзельнікаў магістрант ФГіГ БДУ Раман Пульвас.

Удзельнікам трэба было прайсці два туры алімпіяды. Кожны этап уключаў тэст з 50 пытанняў па фізічнай геаграфіі, геаэкалогіі, землязнаўстве, метэаралогіі, эканамічнай, сацыяльнай, палітычнай, рэкрэацыйнай геаграфіі свету і інш.

Усяго за званне галоўнага знаўцы змагаліся больш за 180 студэнтаў і магістрантаў з 17 ВНУ Беларусі, Расіі, Казахстана і Узбекістана. Сярод іх БДУ, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны, Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Еўразійскі нацыянальны ўніверсітэт імя Л. М. Гумілёва, Усходне-Казахстанскі ўніверсітэт імя Сарсена Аманжолава, Нацыянальны ўніверсітэт Узбекістана імя Мірзо Улугбека і інш.

Арганізатарамі алімпіяды выступілі ФГіГ БДУ, Беларускае геаграфічнае таварыства і Казахстанскае нацыянальнае геаграфічнае таварыства. Мерапрыемства было накіравана на актывізацыю міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне геаграфічных ведаў і стварэнне адзінага адукацыйна-інфармацыйнага асяроддзя ў сферы навук аб Зямлі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Лакацыі актыўнасці*

# ЗАНЯТАК ПА ДУШЫ — ДЛЯ КОЖНАГА

**Больш за 1,5 тысячы мерапрыемстваў для юнакоў і дзяўчат пройдуць у рэгіёнах краіны пад патранатам Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі да 25 чэрвеня ў час «Тыдня моладзі і студэнцтва».**



Фота з сайта БРСМ.

Традыцыйна да аднаго з самых любімых моладдзю свят — Дня моладзі і студэнцтва, які будзе адзначацца 25 чэрвеня, Цэнтральны камітэт і тэрытарыяльныя арганізацыі БРСМ падрыхтавалі вялікую колькасць мерапрыемстваў. Найбольш маштабныя праекты са статусам «рэспубліканскі» запланаваны ў сталіцы. Суперфінал новага праекта Саюза моладзі «Міс і містар студэнцтва Рэспублікі Беларусь — 2023» аб'яднаў самых таленавітых і артыстычных студэнтаў з усёй Беларусі — усяго 22 удзельнікі. На галоўныя тытулы праекта прэтэндавалі 500 чалавек з 42 устаноў вышэйшай адукацыі краіны. Сёння ў Рэспубліканскім доме моладзі адкрываецца тэматычная выстаўка фотаработ удзельнікаў другога сезона рэспубліканскай патрыятычнай акцыі «Беларусь: да і пасля».

24 чэрвеня на плошчы Дзяржаўнага сцяга ў Мінску адбудзецца афіцыйная цырымонія адкрыцця трэцяга працоўнага семестра з удзелам больш як 800 байцоў, камандзіраў і камісараў студатрадаў з усіх куткоў Беларусі. Камандзірам абласных і Мінскага гарадскога штабоў студэнцкіх атрадаў, а таксама кіраўнікам працоўных праектаў «Аўтазаводзец», «Атлант», «Горад маладосці», «Дарога магчымасцяў», «Медыкус», «Палессе», «Тэрратрабудаўнік» уручаць працоўныя пуцёўкі для ўдзелу ў юбілейным сезоне Беларускіх студэнцкіх атрадаў, якія сёлета адзначаюць 60-годдзе.

У Гродне ўжо рэалізаваны праект для дзяцей, якія займаюцца навукай, «Старт для новых ідэй», а ў Магілёве — абласны стартап-праект для студэнцкай моладзі Mobile LAB (PROСтарт). Учора ў Гомелі прайшоў абласны злёт студэнцкіх атрадаў для непаўналетніх, у Магілёўскай вобласці стартаваў маладзёжны патрыятычны праект «Дарогамі Памяці і Славы».

Заўтра ў аграгарадку Дзівін Кобрынскага раёна ў сельскагаспадарчых спаборніцтвах і творчых конкурсах за выхад у рэспубліканскі фінал будуць змагацца «Уладары вёскі» Брэсцкай вобласці, а ў Мінску арганізатары маладзёжнай эстафеты «Народная зарадка» чакаюць удзельнікаў на галоўным полі Нацыянальнага алімпійскага стадыёна «Дынама».

24 чэрвеня на набярэжнай Сожа ў Гомелі пройдзе фестываль маладзёжных культур «Моладзь-фэст». У Брэсце ў гэты дзень запланаваны гала-канцэрт «Моладзь за творчасць».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ПЛЕЯДА МАЛАДЫХ

Кацярына ШАБЛІНСКАЯ:

# «РАСЦІ ЯК ДОКТАР, А НЕ ПА КАР'ЕРНАЙ ЛЕСВІЦЫ»



**Нашай суразмоўніцы — 28, і сёння яна ўзначальвае кардыялагічнае аддзяленне Смаргонскай цэнтральнай раённай бальніцы. Да яе меркавання прыслухоўваюцца і больш вопытныя калегі, і нават самыя скептычна настроеныя пацыенты, многім з якіх яна па ўзросце прыходзіцца ва ўнучкі. Пры гэтым дзяўчына ўпэўненая, што сама найперш не кіраўнік, а ўрач, задача якога — штодзень дапамагаць. «Важна расці не па кар'ернай лесвіцы, а як доктар» — з такім прынцыпам яна штодзень імкнецца атрымліваць новыя веды, без якіх у сучаснай медыцыне немагчыма. І працуе ў тых месцах, дзе найбольш складана — і яе аддзяленне, і начныя дзяжурствы ў прыёмным пакоі якраз з такіх.**
**Кацярына перакананая, што жыццё можа быць цікавым і насычаным і ў невялікім горадзе, а калі нешта не задавальняе — можна пастарацца тое выправіць, праявіўшы ініцыятыву.**

## «Ведала, што вярнуся працаваць у родны горад»

***— Кацярына, спачатку раскажыце, чаму вырашылі стаць урачом?***

— У маёй сям'і не было медыкаў. Ні бацькі, ні дзядулі з бабулямі не мелі дачынення да медыцыны. У школе думала, што буду настаўніцай ці доктарам. Я, дарэчы, вучылася ў сельскай школе. На выбар паўплывалі мае настаўнікі. Мне добра даваліся хімія і біялогія, я іх любіла. У 11-м класе дзякуючы настаўнікам пачала задумвацца, што, напэўна, буду паступаць у медыцынскі. Узмоцнена рыхтавалася. І з маёй аднакласніцай мы паступілі ў Гродзенскі медыцынскі ўніверсітэт.

Паступала па мэтавым накіраванні, хоць і па балах я праходзіла. Аднак ведала, што прыеду працаваць па месцы жыхарства, у Смаргонь, іншых варыянтаў не разглядала. І цяпер не памяняла б свайго меркавання, бо не шкадую, што прыехала сюды.

У Смаргонскай ЦРБ мы праходзілі практыку, пазнаёміліся з калегамі, таму было прасцей прыходзіць на інтэрнатуру. Праўда, яна ў нас атрымалася выпрабаваннем у пэўным сэнсе. Мы ўпершыню адчулі сябе самастойнымі, працавалі нароўні з урачамі — вялі палаты, прызначалі лячэнне, абслугоўвалі выклікі, хоць і пад кантролем вопытных калег. Давялося папрацаваць у розных аддзяленнях: пералівання крыві, інфекцыйным, прыёмным, урачом агульнай практыкі і больш за ўсё ў кардыялагічным. Гэта і паўплывала на выбар спецыялізацыі.

***— На сваё першае працоўнае месца вы прыйшлі ўжо ў якасці кардыёлага?***

— Я размеркавалася як урач агульнай практыкі, ва ўніверсітэце праходзіла субардынатуру па гэтай спецыялізацыі. Прызначылі ўчастак — мікрараён Усходні. Мне вельмі падабалася: добры ўчастак, добрыя людзі, у мяне атрымлівалася з імі ўзаемадзейнічаць. Хоць я была зусім малады доктар, яны да мяне прыслухоўваліся. На ўчастку была вопытная медсястра Ніна Іванаўна Самахвастоўская, якая ведала характар усіх пацыентаў, падыход да іх, яна мяне і навучала.

Ніне Іванаўне «шанцавала» на ўрачоў. Звычайна яны працавалі толькі па два гады, а потым сыходзілі на павышэнне. Яна і мне сказала, як я толькі прыйшла: «Ты не затрымаешся». Спрачалася: «Нікуды не пайду, хачу застацца тут». Але Ніна Іванаўна не памылілася: я папрацавала на ўчастку ўсяго два гады.

Падпрацоўвала ў стацыянары ў кардыялагічным аддзяленні на замене калег, якія былі ў водпусках і на бальнічных. І потым перайшла на стаўку ў стацыянар, хоць яшчэ нейкі час заставалася падпрацоўваць у паліклініцы на ўчастку. Мне там падабалася, і калі б у мяне было больш вольнага часу, я і цяпер там бы падпрацоўвала.

## «У прыёмным пакоі заўсёды даводзіцца праводзіць маленькае расследаванне»

***— Чым цікавая работа на ўчастку?***

— Дынамікай, бо бачыш вынік у пацыентаў. Працуеш з самымі рознымі дыягназамі і падцягваешся па самых розных паталогіях. Мне падабалася і тое, што ўчастак быў размешчаны блізка, на выклікі я хадзіла пешшу, гэта не выклікала ніякіх цяжкасцяў.

А са жніўня 2020 года запрасілі працаваць у стацыянар урачом-кардыёлагам. Пазней скончыла чатырохмесячныя курсы па гэтай спецыялізацыі.

Працую кардыёлагам ужо трэці год, але кожны дзень — як першы. Здаецца, ужо маю пэўны досвед, але штодня з'яўляецца тое, з чым раней не сустракалася. Апрача таго, бяру дзяжурствы ў прыёмным пакоі. Кожны раз ідзеш на іх, і абавязкова прывозяць пацыента з дыягназам, з якім раней не сутыкалася, ці пацыента, якога раней не лячыла, і трэба вырашаць галаваломку, як лепш паступіць. Тут трэба ўвесь час вучыцца.

***— Ці частыя сітуацыі, якія ставілі вас як маладога доктара ў тупік?***

— І дагэтуль так часам здараецца. Большасць паталогій у пацыентаў — камарбідныя (калі адначасова развіваецца некалькі захворванняў, і яны ўплываюць адно на адно) ці з прычыны ўзросту тыя маюць шмат захворванняў рознага профілю. Але ёсць старэйшыя калегі, у якіх можна спытаць.

Папярэдняя загадчыца майго аддзялення, Алена Іванаўна Саўко, заўсёды параіць, што рабіць. Яна доўга ўзначальвала аддзяленне, яе вельмі любяць і паважаюць пацыенты. І яна, нягледзячы на пенсіённы ўзрост, яшчэ працуе на палову стаўкі, каб падвучыць мяне і дапамагчы. У яе вялікі досвед, яна ведае, як дзейнічаць у сумніўных сітуацыях.

Да таго ж дзяжуру ў прыёмным пакоі і па бальніцы як урач-тэрапеўт, а акрамя мяне ёсць дзяжурныя хірург, анестэзіёлаг, з дзецьмі працуе ўрач-педыятр. Вядома, з рознымі паталогіямі прывозяць. Калі нейкія надзвычайныя сітуацыі, скажам, цяжкае ДТЗ, нам тэлефануюць з «хуткай», і мы ўсе напагатове: і рэаніматолагі, і хірургі, і тэрапеўты.

У прыёмным аддзяленні заўсёды даводзіцца праводзіць маленькае расследаванне, каб вызначыцца з характарам паталогіі і з прычынай, якая магла выклікаць той ці іншы стан. Амаль кожны дзень паступаюць цяжкія пацыенты, якія шпіталізуюцца ў рэанімацыю, і тут без расследавання не абысціся, асабліва калі пацыент без прытомнасці. У яго не спытаеш, што непакоіць, можаш толькі аб'ектыўна і па аналізах ставіць дыягназ і строіць здагадкі.

Але гэтымі непрадказальнасцю і неабходнасцю пастаянна вучыцца і цікавая работа ў прыёмным пакоі. У кардыялагічным аддзяленні крыху іншая спецыфіка. Тут у асноўным пацыенты пажылога ўзросту. І ў нас сабрана ўся кардыялагічная паталогія, у адрозненне ад вялікіх бальніц, дзе ёсць інфарктныя, постінфарктыя аддзяленні.

Падчас ковіду, калі іншыя аддзяленні закрываліся, наша працавала і па кардыялагічнай паталогіі, і па тэрапеўтычнай — тут лячыліся ўсе неінфіцыраваныя пацыенты.

***— А вам падчас пандэміі давялося працаваць з ковіднымі пацыентамі?***

— Так, я працавала менавіта з такімі. Гэта быў самы цікавы час. Мне здаецца, я тады вельмі істотна расла як доктар. У першую хвалю вяла прыём у паліклініцы і абслугоўвала выклікі. А калі перафарміроўвалі стацыянар, працавала загадчыкам у адным з ковідных аддзяленняў. У мяне быў цэлы корпус з хворымі. Мы там праводзілі ўвесь свой час, толькі спаць ішлі дадому.

Я не пашкадавала пра гэты перыяд, бо бачыла дынаміку пацыентаў. Чалавек паступае ў крытычным стане, ты яму дапамагаеш, ён выпісваецца і кажа табе «дзякуй» — гэта тое, дзеля чаго працуе кожны доктар. Я была ім і як урач, і як сябар, і як псіхатэрапеўт. Амаль увесь час праводзіла ў палатах з хворымі. Было цяжка, часам не вытрымлівала. Але ніколі не пашкадавала, што пагадзілася там працаваць.

Падчас пандэміі амаль ва ўсіх сітуацыях ты працуеш як Шэрлак Холмс: думаеш, чаму такія вынікі аналізаў прыйшлі, высвятляеш, шукаеш прычыну. У рэанімацыю штодзень пераводзілі пацыентаў, былі смяротныя выпадкі. І ты ўжо інстынктыўна адчуваеш, якая дынаміка будзе і ў які момант трэба рэагаваць.

***— Якія самыя цяжкія моманты ў рабоце?***

— Калі пацыенту не ўдаецца дапамагчы. Асабліва калі пачынаеш сумнявацца: а магчыма, яшчэ штосьці трэба было паспрабаваць, магчыма, штосьці яшчэ ты мог зрабіць. Ёсць выпадкі, калі ты і сапраўды не мог дапамагчы, але ўсё роўна ў галаве пракручваеш: а магчыма, трэба было яшчэ, а магчыма, штосьці іншае. Цяжка думаць, што не паспеў, памыліўся, няпроста прымаць рашэнні, ад якіх залежыць жыццё чалавека. І самае складанае, калі ты бачыш, што нічым не можаш дапамагчы, калі на лячэнне арганізм пацыента не рэагуе.

Кожны раз ідзеш на абход і думаеш: «Ну, калі ласка, скажыце, што вам лепш, ну хоць крыху». Усё прызначаеш, як трэба, а стан пацыента не паляпшаецца, — на жаль, бывае і так.

***— Ёсць рашэнні, магчыма, нестандартныя, якімі вы ганарыцеся, якія выратавалі жыццё?***

— Яны былі ў асноўным падчас каранавіруса, тады быў больш заўважны такі эфект работы. Звычайна я не засяроджваю на гэтым увагу. Радуюся нават маленькаму выніку. Вядома, ёсць і вялікія, асабліва гэта датычыцца інфарктных пацыентаў, у якіх своечасова заўважылі паталогію, зрэагавалі і правялі тромбалізіс.

***— Якое, на ваш погляд, самае складанае аддзяленне?***

— Кардыялагічнае: гэта складаная і адначасова цікавая работа. Тут кожны дзень прыходзіцца прымаць важныя рашэнні. Штодзень іду на работу і думаю: што ж мяне чакае?

## Успрымаюць як дачку ці ўнучку

***— Ці цяжка знаходзіць агульную мову з пацыентамі, асабліва ўзроставымі?***

— Вельмі проста. Яны мяне ўспрымаюць як унучку ці дачку. Стараюся іх пераконваць, што варта прымаць лекі і дома — пастаянна. Яны да мяне прыслухоўваюцца. Калі прыходжу ў іншыя аддзяленні, сама магу не памятаць, што некалі лячыла гэтага пацыента, а яны помняць, усміхаюцца, дзякуюць. І мне вельмі прыемна.

Ёсць пацыенты, якія першапачаткова настроеныя негатыўна і, не ведаючы цябе, упэўнены, што ты так сабе доктар. Але ў любым выпадку трэба імкнуцца знайсці кантакт і пераканаць іх. З дабрынёй стаўлюся да ўсіх пацыентаў.

Прыходзіш да бабуль — ім часта вельмі не хапае ўвагі. Прызначаеш прэпараты, і яны працуюць, калі ты размаўляеш з людзьмі, расказваеш, чаму павышаецца ціск, чаму змяненні ў ЭКГ. Калі кантактуеш з пажылымі людзьмі, у іх мяняецца настрой, яны перастаюць хандрыць і папраўляюцца. Мае бабулі часта пішуць падзякі ў журнал водгукаў. Нам іх потым зачытваюць на «пяціхвілінках».

***— Вы згодныя, што ў хваробах сэрца і сасудаў у многім вінаваты спосаб жыцця чалавека?***

— І гэта таксама. Сёння ўсе хваробы сардэчна-сасудзістай сістэмы маладзеюць. У нашым аддзяленні можна сустрэць пацыентаў, якім крыху за 40, у асноўным з артэрыяльнай гіпертэнзіяй. Шмат што залежыць ад харчавання. Пацыенты не жадаюць прытрымлівацца дыеты і разумець, што ёсць прадукты, якія ім нельга. Расказваеш пра халестэрын, атэрасклероз, які з'яўляецца асноўным наступствам ужывання тлустай ежы і парушэння абмену рэчываў, але не ўсе гэта ўспрымаюць.

З фізічнай нагрузкай дзве крайнасці. Ёсць пацыенты, якія яе вельмі любяць, нават калі ім нельга перагружацца. А многія не могуць з-за захворванняў, у прыватнасці, хваробы суставаў, рухацца больш. З усімі праводзім работу. У нас працуе школа гіпертоніка — лекцыі, якія мы чытаем для пацыентаў. Часта я проста ў палатах расказваю пра артэрыяльную гіпертэнзію, важнасць дыеты, атэрасклероз.

Вельмі важна пастаянна прымаць прызначаныя лекі. Нярэдка пацыенты пап'юць прэпараты пэўны час, дапамагло — і перастаюць прымаць. Варта ўсё ж слухаць і прытрымлівацца ўсіх рэкамендацый урача. Не прымаць па-свойму і тое, што сам набыў, таксама не цярпець боль і прыязджаць па дапамогу не ноччу на чацвёртыя суткі, а прыслухоўвацца да свайго стану і ўсё рабіць своечасова.

## Ад участковага ўрача да загадчыка аддзялення

***— Раскажыце пра сваё аддзяленне.***

— У нас дзесяць палат на 35 ложкаў. Працуюць тры ўрачы: я на 1,25 стаўкі, ёсць доктар-сумяшчальнік на чвэрць стаўкі і ўрач на палову стаўкі. Яны вядуць па адной-дзве палаты, а я — усе астатнія. Стабільна мае шэсць палат.

Я сумяшчаю абавязкі загадчыка, гэта ў тым ліку кансультацыі пацыентаў з кардыялагічнай паталогіяй у прыёмным і іншых аддзяленнях, у рэанімацыйным аддзяленні, прыём цяжарных пацыентак з кардыялагічнай паталогіяй. Работы шмат, галоўнае — усё паспець.

***— Як праходзіць ваш рабочы дзень?***

— Я прыходжу раней, прыкладна за гадзіну, каб падрыхтавацца да абходу, перагледзець яшчэ раз гісторыі хваробы, аформіць гісторыі пацыентаў, якія рыхтуюцца да выпіскі, запоўніць дакументы. Магу пачаць абход пацыентаў яшчэ да «пяціхвілінкі», да 8.30. Медсёстры паведамляюць, хто з пацыентаў дрэнна сябе адчуваў уначы, да іх абавязкова падыходжу.



**Маладая доктар заўсёды працуе там, дзе складана, — падчас пандэміі ўзначальвала ковіднае аддзяленне.**

Пасля «пяціхвілінкі» мы накіроўваемся ў рэанімацыю, раблю свае агляды кардыялагічных пацыентаў, прызначэнні, праводзім кансіліумы. Потым пачынаю абход у сваім аддзяленні, тут і выпіска, і паступленне пацыентаў, якія ідуць на працягу цэлага дня. Калі патрэбна, даю кансультацыі. Шмат часу займае папяровая работа, часам даводзіцца браць яе на выхадныя дадому. Цяпер мы пераходзім на электронныя гісторыі, але ўсё роўна гэта займае шмат часу. Пакуль мая калега ў водпуску, працую на паўтары стаўкі — прынамсі да сямі вечара знаходжуся на рабоце. Калі дзяжуру, то застаюся і на ноч.

Пакуль маладая і энергічная, з такім графікам пачуваюся нармальна. Бяру дзяжурствы ў прыёмным пакоі. Усё паспяваю. Стараюся ўсё рабіць хутка: хутка хаджу, хутка пішу, заўсёды чымсьці занятая і амаль не сяджу. Проста пасядзець і адпачыць часу няма: з'явілася хвілінка — запаўняю гісторыю хваробы. Пастаянна нехта з пацыентаў адчувае сябе дрэнна, хтосьці паступае і трэба яго паглядзець, або выпіска і афармленне. Пастаянны рух.

***— Як вы ў 28 гадоў сталі загадчыкам аддзялення?***

— Я пакуль выконваю абавязкі загадчыка аддзялення, бо адносна нядаўна прайшла курсы па перакваліфікацыі, і пакуль недастаткова стажу, каб здаць на кваліфікацыйную катэгорыю па кардыялогіі. Гэта мяне чакае ў верасні, і тады пайду на зацвярджэнне.

Яшчэ падчас інтэрнатуры мы шмат працавалі ў аддзяленні кардыялогіі, і я ведала спецыфіку. Пасля падчас работы ўрачом агульнай практыкі замяняла калег, і мне прапанавалі папрацаваць у стацыянары.

Пагадзілася, бо гэта іншая работа, чым у паліклініцы — больш складаная, пацыенты цяжкія. І гэта развіццё ў прафесійным плане.

Калі мая старэйшая калега Алена Іванаўна пайшла на заслужаны адпачынак, мне прапанавалі ўзначаліць аддзяленне. З таго часу выконваю абавязкі загадчыка.

***— Вы ўжо дасягнулі таго, да чаго многія вашы калегі прыходзяць у больш познім узросце...***

— Не адчуваю сябе загадчыкам, найперш я — проста доктар. Стаўлю сабе іншыя «плюсікі»: сёння дапамагла пацыентцы, усё зрабіла правільна, значыць — малайчына. Мне важна расці як урач, а не па кар'ернай лесвіцы. Калі маіх ведаў становіцца больш, пачуваюся больш упэўнена. Гэта дазваляе хутчэй рэагаваць, хутчэй разабрацца ў праблеме і быць больш эфектыўнай. Важна расці ўнутры сябе.

***— Ці ёсць магчымасці атрымліваць новыя веды, праходзіць дадатковыя курсы?***

— Цяпер для гэтага нават неабавязкова кудысьці ездзіць, іх шмат праводзіцца анлайн. Ёсць адпаведныя лекцыі, і мы падпісаныя на іх. І нават калі запаўняю дакументацыю, абавязкова штосьці слухаю. Калі вучылася на курсах па першай спецыялізацыі, нашы паважаныя выкладчыкі далі шмат інфармацыі, але яна базавая. Многае даводзіцца шукаць самастойна. Часам нас накіроўваюць на спецыялізаваныя канферэнцыі, там таксама можна атрымаць новыя веды. І на сваім досведзе штодзень вучымся, гэта самае галоўнае.

## Вырасла ў творчай сям'і

***— Жадання пераехаць у абласны цэнтр ці сталіцу няма?***

— Наўрад ці з'еду, бо мне падабаецца мой горад. Я тут нарадзілася, тут мой муж, мае сваякі, сябры, і я не задумвалася, каб пераехаць.

Цяпер у нашай бальніцы з'явілася больш маладых дактароў. Прыйшло некалькі маіх аднагодак — і ўрачоў агульнай практыкі, і вузкіх спецыялістаў. Вядома, ёсць цякучасць кадраў, але калі людзі ствараюць тут сям'ю, то, як правіла, застаюцца. У нас цяпер маюцца ўсе спецыялісты, апошні год бальніца нават не падавала заявак на размеркаванне.

***— Як для маладых спецыялістаў вырашаецца жыллёвае пытанне?***

— Спачатку, калі размяркоўваліся як маладыя спецыялісты, мы з аднакурсніцай атрымалі месца ў інтэрнаце, паколькі мы з раёна. Пасля я дастаткова актыўна ўдзельнічала ва ўсіх мерапрыемствах, выйграла ў раёне конкурс маладых спецыялістаў, і мне далі ад бальніцы арэнднае жыллё, якое на той час вызвалілася...

***— Раскажыце падрабязней пра актыўнасці, у якіх удзельнічалі.***

— Пачынаючы з інтэрнатуры, мы з маімі аднагодкамі дастаткова актыўна бралі ўдзел у жыцці бальніцы: ва ўсіх спартыўных спаборніцтвах, турзлётах, творчых конкурсах. Праводзіўся конкурс маладых спецыялістаў раёна, дзе ўдзельнічалі прадстаўнікі розных арганізацый.

Сама напісала сваю праграму, у тым ліку верш пра медыцыну. У мяне добра атрымліваецца пісаць вершы з нагоды, і мне гэта падабаецца. Падрыхтавала песню, іншыя нумары і заняла першае месца. У абласным конкурсе паўдзельнічаць не давялося, бо пачаўся ковід, і яго не праводзілі.

Часта ўдзельнічала ў музычных мерапрыемствах. Я вырасла ў творчай сям'і. Мая мама працуе ў Доме культуры, і дома ўсе спяваюць і іграюць на музычных інструментах. Я таксама заканчвала музычную школу па класе акардэона, на гітары навучылася іграць самастойна і песні сама пісала, з якімі мы ездзілі на турзлёты ў школе. Напэўна таму валодаю непераадольным абаяннем перад бабулямі. Цяпер, вядома, вольнага часу не стае, а калі працавала ў паліклініцы, пастаянна дзесьці ўдзельнічала.

## Знайсці занятак даспадобы ў невялікім горадзе

***— Чым цяпер запоўнены ваш вольны час?***

— Калі ў горадзе праводзяцца мерапрыемствы — музычныя ці інтэлектуальныя гульні, — мы з сябрамі ўдзельнічаем. Наведваю трэнажорную залу ці фітнес, гэта добра мяне разгружае пасля работы. Люблю любую актыўнасць, шмат хаджу пешшу.

У грамадскім жыцці ўдзельнічаю, выступаю на мерапрыемствах. Я член БРСМ, а таксама адказваю за работу з моладдзю ў прафсаюзе. Імкнуся прыцягнуць іх да розных мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў раёне. Для маладых спецыялістаў іх шмат — і спартыўныя, і інтэлектуальныя конкурсы, і турзлёты, і экскурсійныя паездкі. Шмат магчымасцяў. Да таго ж прафсаюз заўсёды выдаткоўвае прэмію за актыўнасць.

***— Наколькі цікавая для моладзі Смаргонь? Ці ёсць месцы, дзе можна правесці вольны час?***

— Горад маленькі і кампактны. Не хапае скейт-парку. Шмат моладзі любіць катацца на скейтах, часта проста на прыступках усіх магазінаў. Цяпер, здаецца, гэта пытанне вырашаецца. Няма ў нас і кінатэатра, найбліжэйшы толькі ў Маладзечне.

Але ўтульныя месцы, дзе можна правесці час, ёсць. Маюцца кавярня, басейн, спартыўныя залы, вось нядаўна адчынілася новая трэнажорная зала. У горадзе актыўна працуе БРСМ, праводзіць шмат мерапрыемстваў для працуючай моладзі — спартыўных, інтэлектуальных. «Штольня», «Мазгабойня», іншыя інтэлектуальныя конкурсы, куды можна прыйсці сваёй камандай і паўдзельнічаць. Пры жаданні цікава і карысна правесці час заўсёды можна знайсці сабе занятак.

**Алена КРАВЕЦ,**
**фота аўтара**
**і з асабістага архіва гераіні.**

*Аўдыяверсія праекта — на радыё Пілот-FM і на сайце zviazda.by.*

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор электронных торгов | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | Ельский лесхоз, Гомельская область, г. Ельск, Мозырский тракт, 6 |
| Оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by. |

**Предмет электронных торгов: спецтехника, бывшая в употреблении, расположенная по адресу: Гомельская область, г. Ельск, Мозырский тракт, 6**

| Лот № | Наименование | Начальная цена, с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Трактор** МТЗ 82.1, р/зн. ЕА-3 9609, 2008 г. в., № кузова 80865488, | 5 760,00 |
| 2 | **Погрузчик** универсальный «Амкодор» 352, р/зн. ЕВ-3 0645, 2008 г. в., № кузова Y3A352Л0080048. | 43 800,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 24.07.2023.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **21.07.2023** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу (http://gki.gov.by) 22.06.2023 г.**

**Контактные телефоны:** +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06.
**E-mail:** auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32»** (222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б) **проводит открытый аукцион по продаже:**

## ЛОТ № 1: здание проходной

**с инв. № 630/С-46867 общей площадью 10,4 кв. м, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/1.**
**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 2 280,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **228,00** бел. руб.

## ЛОТ № 2: котельная

**с инв. № 630/С-46858 общей площадью 528,7 кв. м, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/7.**
**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 68 280,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 6 828,00** бел. руб.

**Здание проходной и котельная расположены на земельном участке с кадастровым номером 642000000001000776 (право постоянного пользования) площадью 5,3062 га, для их обслуживания будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.**

## ЛОТ № 3: склад

**с инв. № 630/С-79863 общей площадью 87 кв. м, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б/6, расположен на земельном участке с кадастровым номером 623850100002004253 (право постоянного пользования) площадью 4,6001 га, для обслуживания будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.**
**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 31 920,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 3 192,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB3012108260016 9330000 в ЦБУ № 701 ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) **возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника предмет торгов продается ему по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Аукцион состоится **24.07.2023 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.07.2023** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11, телефон для осмотра: 8 (029) 351 10 33.**

УНП 600077220

**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**
организатор торгов по продаже имущества **ОДО «ФАРМИН»** (УНП 190073936),
объявляет о проведении **05.07.2023 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by.
Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении **18 июля 2023 года** повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| **Капитальное строение с инв. № в ЕГРНИ 600/С-122808 общей площадью 24,4 кв. м (наименование: помещение насосной станции мазута; составные части и принадлежности: кирпичное здание помещения насосной станции мазута 3А1/к, с резервуарами под мазут а1)** |
| Сведения о земельном участке: площадь – 0,0774 га, кадастровый номер – 623650100001005578 |
| Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17/3 |
| Начальная цена: 100 000,00 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 10 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **18 июля 2023 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 22.06.2023 по 14.07.2023** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Криница»**

Аукцион состоится **25.07.2023 в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1:** МАШИНА СТИРАЛЬНАЯ Л-10-211,
инв. № 12297.
Начальная цена с НДС 20 % – 3 120,00 руб.
Задаток – 400,00 руб.

**Лот № 2:** ПРЕСС ГЛАДИЛЬНЫЙ КР-516,
инв. № 12396.
Начальная цена с НДС 20 % – 9 000,00 руб.
Задаток – 1 100,00 руб.

**Место нахождения Лотов № 1 и № 2:**
г. Минск, ул. Радиальная, 52. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатка – 21.07.2023 в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

**ОАО «ГОМЕЛЬОБЛРЕКЛАМА»**
**филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ООО «Гомельская Инжиниринговая Компания» – управляющая компания холдинга «Стройинжиниринг Групп» в лице ликвидатора – директора ООО «Модель антикризисного управления» Будкова К.В. извещает о проведении 5 июля 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 70 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **Местонахождение лотов №№ 2-7; №№ 10-15:** Гомель, ул. Малайчука, 12 | | | |
| **1** | **Капитальное строение с инв. № 210/С-11497**, площадью **118,00 кв. м**, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – **магазин.** Составные части и принадлежности: склад. Адрес: Витебская обл., Браславский р-н, Межанский с/с, 16, вблизи д. Усяны. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **220885615401000067** общей площадью **0,0757 га (право постоянного пользования). Адрес:** Витебская обл., Браславский р-н, Межанский с/с, 16, вблизи д. Усяны. **В состав лота № 1 входят 58 единиц инвентаря и оборудования** | 9 730,80 | **973,08** |
| **2** | Станок для резки блоков Белмаш MCS-400, 2020 года выпуска, инв. № 00000025 | 612,00 | **61,20** |
| **3** | **Автомобиль LADA 21703**, рег. № 8064 ЕН-6, 2010 года выпуска, тип ТС – легковой седан, тип двигателя – бензиновый, МКПП | 720,00 | **72,00** |
| **7** | **Автомобиль VAZ 21703**, рег. № 5071 IP-3, 2012 года выпуска, тип ТС – легковой автомобиль седан, тип двигателя – бензиновый, МКПП | 2 016,00 | **201,60** |
| **8** | Вагон-бытовка (инв. № 00000016). **Местонахождение:** Гомельская обл., Брагинский р-н, аг. Микуличи | 648,00 | **64,80** |
| **9** | Контейнер металлический (инв. № б/н). **Местонахождение:** Гомельская обл., г. Житковичи | 1 080,00 | **108,00** |
| **10** | Невелир оптический BOSCH GOL 20 D (инв. № 00000014) | 72,00 | **7,20** |
| **11** | Персональный компьютер Dell Vostro Desktop 3670 (инв. № 00000050) | 396,00 | **39,60** |
| **12** | МФУ Canon i-Sensys MF3010 (инв. № б/н) | 252,00 | **25,20** |
| **13** | МФУ лазерное Brother DCP-L2540DNR (инв. № б/н) | 468,00 | **46,80** |
| **14** | Принтер Canon i-Sensys LBP623Cdw (инв. № б/н) | 468,00 | **46,80** |
| **15** | Принтер Epson V1120 (C11CG96405) (инв. № б/н) | 144,00 | **14,40** |

**Продавец:** Общество с ограниченной ответственностью «Гомельская Инжиниринговая Компания» – управляющая компания холдинга «Стройинжиниринг Групп», 246028, г. Гомель, ул. Малайчука, 12.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 611-98-91 – зам. директора Антон Александрович.**

**Шаг аукционных торгов –** 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

